КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 23 (199)
◂ 18 ЧЭРВЕНЯ ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



УЛАДЗІМІР КОЛАС
Стар. 4

**СУПРАЦЬ ЛЮДЗЕЙ І ГІСТОРЫІ**
У Мінску жыхары дамоў па вуліцы Рэвалюцыйнай змагаюцца супраць гарадскіх уладаў за сваю маёмасць і захаванне гістарычнай забудовы горада
Стар. 6

**ФУТБОЛ: ПЕРАМОГА АБО СМЕРЦЬ**
Інтрыга цяперашняга Кубка свету не толькі ў тым, хто стане чэмпіёнам. У турніры бяруць удзел каманды, сустрэчы паміж якімі за доўгія гады набылі характар сапраўднай вендэты
Стар. 11

**СВЯТАЯ ЕФРАСІННЯ І ЯЕ СКАРБЫ**
Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**
**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ — 60**
Нарыс Марыі Мартысевіч

▸ З НАГОДЫ

# ВЫМУШАНЫ ГУМАНІЗМ

Вольга ХВОІН

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу ўхваліў законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў». Па амністыі з папраўчых устаноў закрытага тыпу можа быць вызвалена каля 2 230 чалавек, з установ адкрытага тыпу — каля 900 чалавек, скарочаны тэрмін пакарання 9 300 асуджаным. Улады шторазу прэзентуюць амністыю як акт гуманізму. Але за адваротным бокам медалю хаваецца не толькі намер даць яшчэ адзін шанец асуджаным.**




Беларусь па колькасці зняволеных на 100 тысяч насельніцтва займае другое месца ў Еўропе пасля Расіі, а ў свеце — трэцяе-чацвёртае. У дэпартаменце выканання пакаранняў МУС Беларусі не хаваюць, што цяпер практычна кожны сёмы грамадзянін, які пражывае на тэрыторыі Беларусі, наўпрост або ўскосна звязаны з турмой — ці сам адбывае пакаранне, ці сваякі адбываюць. Да слова, сярэдні тэрмін пазбаўлення волі ў нас таксама адзін з самых высокіх у Еўропе — 6,3 гады. Статыстыка выразна паказвае, што амністыя — гэта яшчэ (ці найперш?) і спосаб крыху зменшыць перапоўненасць пенітэнцыярных устаноў.

Аднак у адным з інтэрв'ю старшыня камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Гумінскі прызнаўся, што «адны амністыі сітуацыю з вялікай колькасцю асуджаных у Беларусі не выратуюць, неабходныя змены ў заканадаўстве». Па словах Гумінскага, для таго, каб Беларусь пакінула адну з лідзіруючых пазіцый сярод краін па паказчыку колькасці асуджаных на 100 тысяч насельніцтва, трэба змяніць пакаранні за эканамічныя злачынствы.

«Маё асабістае меркаванне — людзі, асуджаныя за эканамічныя злачынствы, не павінны знаходзіцца на ўтрыманні ў падаткаплацельшчыкаў. У цяперашні час (другая палова 2009 года — рэд.) у Беларусі 37,5 тысячы чалавек адбываюць пакаранне, з якіх 47 працэнтаў — за эканамічныя злачынствы. Калі мы скароцім у будучым колькасць асуджаных да пакарання, звязанаму з пазбаўленнем волі, то будзем выглядаць больш-менш годна», — лічыць Гумінскі. Адпаведных пажаданням дэпутата зменаў у Крымінальным кодэксе пакуль не было. А колькасць карупцыйных ды іншых крымінальных спраў эканамічнага характару — уражвае.

Да слова, каб паказаць чыноўнікам бязрадасныя перспектывы «зоны», з ініцыятывы генеральнага пракурора Беларусі ў Мінску і іншых рэгіёнах краіны арганізаваныя і праводзяцца экскурсіі ў пенітэнцыярныя ўстановы. Гавораць, што гэтае ноу-хау карыстаецца папулярнасцю.

Паводле законапраекту, пад вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання трапляе шэраг катэгорый асуджаных, сярод якіх — непаўналетнія, цяжарныя жанчыны; жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць непаўналетніх дзяцей; асобы пенсійнага ўзросту; інваліды; хворыя на актыўную форму сухотаў; ВІЧ-інфікаваныя; ветэраны баявых дзеянняў; удзельнікі ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС, а таксама асобы, якія атрымалі раненні пры выкананні абавязкаў у перыяд праходжання службы.

Амністыя хворых на сухоты і ВІЧ-інфіцыраваных — насамрэч акт гуманізму. І не толькі для іх, але і для людзей, якія адбываюць пакаранне побач з імі. У Беларусі нармальнай практыкай ёсць, калі хворыя і здаровыя сядзяць у адной перапоўненай камеры. Пра асобныя камеры, асобнае харчаванне размова не вядзецца. Тым больш што і для звычайных людзей умовы лячэння часам далёкія ад нармальных. Нагадаю, што ў 2008 годзе хворыя на сухоты двойчы абвяшчалі галадоўкі ў лякарнях краіны на знак пратэсту супраць кепскіх умоў лячэння і абразлівага абыходжання з імі медперсаналу.

Былы палітвязень Аляксандр Казулін лічыць, што амністыя — заўсёды акт гуманістычны, але ў нашай краіне мае свае асаблівасці. «З большага амністыя ў Беларусі камерцыйная. То бок, калі ты заплаціў, то можаш патрапіць пад амністыю. Але зарабіць у турме сабе на амністыю немагчыма — у мае часы заробак зняволенага быў недзе 25 тысяч у месяц, не думаю што зараз ён большы. Вось і атрымліваецца, што хто мае грошы, мае і шанцы выйсці на волю, — разважае палітык. — Магу сказаць, што сорак працэнтаў, а можа і ўсе пяцьдзесят, з тых, хто знаходзіўся ў турме разам са мной, можна было не пазбаўляць волі, а пакараць іншымі санкцыямі. Наогул, усе праблемы, пра якія гавораць у прэсе, маюць месца ў беларускай пенітэнцыярнай сістэме. Але, каб нешта змянілася, патрэбная галоснасць, каб людзі ведалі, у якіх умовах знаходзяцца вязні».

Эксперты і праваабаронцы ўмовы ўтрымання ў беларускіх турмах называюць блізкімі да катавання. Так, прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Антоніус Брук заявіў, што ў нашай краіне няма ніводнай турмы, якая б цалкам адпавядала стандартам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па інфекцыйным кантролі. Дыпламат выказваў шкадаванне і з нагоды таго, што ў беларускіх турмах ніколі не праводзіліся даследаванні па пытаннях гвалту, у тым ліку сексуальнага.

Да прыкладу, у Расіі даследаванні паказалі, што больш за 40 працэнтаў зняволеных зведваюць сексуальны гвалт. Спецыялісты ўпэўненыя, што айчынныя «зоны» не з'яўляюцца піянерскім лагерам паводле ўнутраных правілаў жыцця вязняў. Але публічна гаварыць аб іх праблемах улады не гатовыя, прыкрываючы непрыемныя факты адгаворкамі, што турма — не зона адпачынку, і мусіць у чалавека, які туды патрапіў, выклікаць адпаведныя пачуцці.

АКЦЫЯ

# ЗНОЎ «СТОП-БЕНЗІН»

**Акцыя аўтааматараў «Стоп-бензін» супраць росту цэн на бензін будзе працягнута. Пра гэта 15 чэрвеня ў Мінску на пасяджэнні круглага стала паведаміў адзін з ініцыятараў правядзення акцыі Канстанцін Міхайлаў.**

«Акцыя атрымала шырокі рэзананс у грамадстве і будзе працягвацца, натуральна, у рамках закона», — адзначыў Міхайлаў. Арганізатары акцыі, паводле яго слоў, прадоўжаць распаўсюджваць пратэстную сімволіку (налепкі) і чакаць адказу на свой зварот ад Адміністрацыі прэзідэнта.

Як паведамлялася раней, 1 чэрвеня аўтааматары накіравалі ў Адміністрацыю прэзідэнта калектыўны зварот з патрабаваннем перагледзець парадак фарміравання адпускных цэн канцэрна «Белнафтахім» на нафтапрадукты. «Ад адказу на наш зварот будзе залежаць далейшае развіццё падзей», — падкрэсліў Міхайлаў.

Ён не выключыў магчымасць правядзення яшчэ некалькіх паказальных акцый пратэсту, калі ўлады і надалей працягнуць ігнараваць аўтааматараў.

«У прыватнасці, у рамках круглага стала мы планавалі абмеркаваць з прадстаўнікамі канцэрна «Белнафтахім» пытанні цэнаўтварэння на нафтапрадукты. Аднак ніхто з «Белнафтахіма» не адгукнуўся на наша запрашэнне», — падкрэсліў актывіст.

Замест гэтага арганізатары круглага стала атрымалі пісьмовы адказ з канцэрна «Белнафтахім». У лісце ўказана, што дзейнасць канцэрна праводзіцца ў рамках заканадаўства і ўся вычарпальная інфармацыя пра прычыны змены цэн на нафтапрадукты аператыўна размяшчаецца на сайце «Белнафтахіма».

**БелаПАН**

КАДРЫ

# НАРЭШЦЕ ПРЫЗНАЧЫЛІ

**Іван ВАРВАШЭВІЧ**

**Аляксандр Лукашэнка даў згоду на прызначэнне старшынёй Круглянскага райвыканкама Анатоля Дуцько.**

Раней Анатоль Іванавіч працаваў першым намеснікам старшыні Горацкага райвыканкама, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання.

Пасада старшыні Круглянскага райвыканкама заставалася вакантнай больш за год, пасля таго, як напачатку 2009-га былы старшыня Дзмітрый Гобараў быў прызначаны старшынёй Магілёўскага райвыканкама. Увесь гэты час абавязкі кіраўніка раёна выконваў начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксандр Бутараў.

За час вымушанага безладдзя Круглянскі раён здолеў завваліць выкананне шэрагу асноўных прагнозных паказчыкаў за 2009 год і першыя пяць месяцаў гэтага года.

Днямі адбудзецца сесія Круглянскага райсавета, на якой дэпутаты разгледзяць пытанне аб зацвярджэнні Анатоля Дуцько старшынёй Круглянскага райвыканкама.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КААЛІЦЫЯ РАСПАДАЕЦЦА

**Гомельскія рэгіянальныя структуры руху «За Свабоду», Партыі БНФ і Асамблеі няўрадавых арганізацый заявілі пра выхад з мясцовай кааліцыі дэмакратычных сіл.**

15 чэрвеня на прэс-канферэнцыі каардынатар руху «За Свабоду» па Гомельскай вобласці Пётр Кузняцоў растлумачыў гэта рашэнне тым, што частка суб'ектаў рэгіянальнай кааліцыі дэмсіл «вядзе настойлівую агітацыйную працу, якая ідзе ўразрэз з мэтамі і планамі многіх суб'ектаў».

Паводле слоў Кузняцова, прадстаўнікі Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» і Аб'яднанай грамадзянскай партыі распачалі «контрпрадуктыўную агітацыйную кампанію сярод мясцовага дэмакратычнага актыву, якая ўтрымлівае галоўны месідж — давайце не будзем працаваць на выбарах, таму што ў Мінску палітыкі не могуць дамовіцца».

Прадстаўнік Асамблеі няўрадавых арганізацый Галіна Скараход дадала, што апошнім часам каардынацыйны савет рэгіянальных АДС агітуе сябраў былой ініцыятыўнай групы Аляксандра Мілінкевіча не ўдзельнічаць у выбарчых кампаніях прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта, якія не прайшлі працэдуру ўзгаднення адзінага кандыдата ад АДС.

Такая пазіцыя была прынята рэгіянальнымі АДС у ліпені 2009 года, і на дадзены момант гэты дакумент застаўся без змяненняў, адзначыла Скараход. Паводле яе слоў, частка суб'ектаў дадзены дакумент не прызнала, паколькі лічыць яго ўтопіяй у існуючых палітычных умовах.

Гэта не першы канфлікт, які адбыўся за апошні час у асяродку гомельскіх дэмакратаў. На мінулым тыдні кіраўніцтва аргкамітэта партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» праз СМІ абвінаваціла Пятра Кузняцова ў подкупе сваіх актывістаў. Пазней гомельскі каардынатар аргкамітэта БХД Канстанцін Жукоўскі абверг інфармацыю пра які-небудзь подкуп актывістаў.

**Паводле БелаПАН**

ВЫБАРЫ

# ЗАПРАШАЕМ КАНДЫДАТАЎ

**Іван БАРЫСАЎ**

**На канферэнцыю дэмакратычных сілаў Магілёўшчыны запросяць усіх патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты. Такое рашэнне было прынятае 15 чэрвеня на пасяджэнне Каардынацыйнай рады Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сіл.**

У пасяджэнні прынялі ўдзел рэгіянальныя прадстаўнікі асноўных палітычных партый, Асамблеі недзяржаўных арганізацый Магілёўшчыны, руху «За свабоду», незалежных прафсаюзаў і рэгіянальных кааліцый Магілёўскай вобласці.

Пасля працяглай дыскусіі Каардынацыйная рада вырашыла склікаць 10–11 ліпеня гэтага года Магілёўскую абласную канферэнцыю дэмакратычных сіл. Удзел у канферэнцыі прымуць кандыдаты ў дэпутаты мясцовых саветаў, якія здолелі дайсці да рэгістрацыі, сябры Каардынацыйнай рады і па аднаму дэлегату ад кожнага суб'екта кааліцыі дэмакратычных сіл.

Таксама створаны аргкамітэт па падрыхтоўцы Магілёўскай абласной канферэнцыі дэмакратычных сіл, у склад якога ўвайшлі пяць чалавек. Гэта вядомыя на Магілёўшчыны актывісты дэмакратычнага руху: Галіна Лісіцына, Рыгор Кастусёў, Юрый Новікаў, Аляксандр Сілкоў і Уладзімір Шанцаў.

Сябры Каардынацыйнай рады вырашылі накіраваць запрашэнні ўсім патэнцыйным кандыдатам на пасаду прэзідэнта ад дэмакратычных сіл прыняць удзел у канферэнцыі. Патэнцыйным кандыдатам будзе прадастаўлена магчымасць выступіць перад дэлегатамі канферэнцыі і выкласці сваё бачанне стратэгіі і тактыкі дзеяннняў падчас прэзідэнцкай кампаніі.

«Асноўнае пытанне, якое мы павінны разгледзець на канферэнцыі, — лічыць намеснік старшыні Каардынацыйнай рады Юрый Новікаў, — гэта вынікі нашай працы за мінулы перыяд і, асабліва, падчас выбарчай кампаніі ў мясцовыя саветы. Аднак не менш важна даведацца і пра праграмы дзейнасці мяркуемых кандыдатаў на пасаду прэзідэнта. За апошні час рознымі структурамі і самастойна вылучылася столькі патэнцыйных прэтэндэнтаў, што нават дасведчаныя дэмакратычныя актывісты знаходзяцца ў пэўнай разгубленасці. Таму запросім іх усіх, каб паслухаць і зрабіць пэўныя высновы. Магчыма, што прапануем ім нейк дамовіцца паміж сабой, бо ўсе разумеюць, што без аб'яднання намаганняў дэмакратычных сіл ніякіх добрых вынікаў падчас правядзення выбарчай прэзідэнцкай кампаніі дасягнуць не атрымаецца».

На пасяджэнні была прынята да ведама заява Горацкай кааліцыі дэмакратычных сіл, якую агучыў Эдуард Брокараў. Горацкія актывісты перакананыя, што толькі адзінства дэмакратычных сіл дазволіць паспяхова правесці выбарчую кампанію дэмакратычнага кандыдата. Яны лічаць недапушчальнай сітуацыю, калі дэмакратычныя кандыдаты вылучаюцца паасобку, і ў выпадку падобнага вылучэння пакідаюць за сабой права праігнараваць прэзідэнцкую кампанію.

СПРАВА

# СУД ПРАТЭСТ АДХІЛІЎ

**Мінскі абласны суд адхіліў пратэст пракуратуры на апраўдальны прыгавор Івану Міхайлаву, які абвінавачваўся ва ўхіленні ад службы ў арміі.**

Адпаведнае рашэнне Мінскі абласны суд прыняў 15 чэрвеня, паведаміў праваабаронца Валянцін Стэфановіч. Такім чынам, рашэнне Мінскага раённага суда, які прызнаў Міхайлава невінаватым ва ўхіленні ад воінскай службы, набыло моц.

Стэфановіч нагадаў, што раней Міхайлаў быў прызнаны вінаватым па гэтым абвінавачванні і адбыў практычна ўвесь тэрмін арышту на працягу трох месяцаў. «Цяпер Міхайлаў павінен атрымаць пастанаўленне Мінскага абласнога суда і можа падаваць іск аб кампенсацыі яму маральнага ўрону за незаконнае пазбаўленне волі», — сказаў праваабаронца.

21-гадовы вернік абшчыны «Новы запавет» Міхайлаў адмовіўся ад праходжання тэрміновай воінскай службы, на якую быў прызваны ў снежні 2008 года. Ён заявіў прызыўной камісіі Мінскага раёна, што служба ў арміі супярэчыць яго рэлігійным перакананням, і запрасіў альтэрнатыўную службу ў адпаведнасці з артыкулам 57 Канстытуцыі. У гэтым яму было адмоўлена з-за адсутнасці ў Беларусі альтэрнатыўнай грамадзянскай службы. Міхайлаву таксама было адмоўлена ў службе ў рэзерве.

15 снежня 2009 года малады чалавек быў арыштаваны ў Салігорску і змешчаны ў следчы ізалятар, а 1 лютага Мінскі раённы суд прызнаў яго вінаватым ва ўчыненні крымінальнага злачынства за ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву на воінскую службу і прыгаварыў да трох месяцаў арышту. Для адбывання пакарання Міхайлаў быў адпраўлены ў турму № 8 у Жодзіна. Праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя» прызнала Міхайлава вязнем сумлення.

**БелаПАН**

УЛАДА

# «НАШ ДОМ» ІГНАРУЮЦЬ

**40 дэпутатаў Гомельскага гарсавета не далі адказу на заявы актывістаў грамадзянскай кампаніі «Наш дом» з прапановамі праводзіць прыём выбаршчыкаў на тэрыторыі выбарчых акругаў, у памяшканнях ЖЭУ-РЭУ, а не ў працоўны час у службовых кабінетах.**

Актывісты таксама прапанавалі зрабіць адну ці некалькі субот кожнага месяца «адзінымі днямі» асабістых прыёмаў выбаршчыкаў. Гэтыя прапановы былі адпраўлены ўсім дэпутатам гарсавета, але адказу ў вызначаны заканадаўствам тэрмін грамадзяне не атрымалі.

Як паведаміў актывіст кампаніі «Наш дом» Андрэй Аксёнаў, наконт гэтага ён накіраваў скаргу старшыні пастаяннай камісіі мандатнай, па пытаннях этыкі дэпутатаў, законнасці і правапарадку і працы са зваротам грамадзян гарвыканкама Сяргею Шаўлоўскаму. У скарзе актывіст указаў, што дэпутаты парушылі парадак абавязковага разгляду пісьмовых зваротаў грамадзян, ён прыводзіць шэраг спасылак на законы «Аб зваротах грамадзян» і «Аб статусе дэпутата мясцовага савета».

Аксёнаў давёў да ведама старшыні камісіі, што ніводзін з 40 дэпутатаў не разгледзеў асабіста прапановы грамадзян, не прыняў меры для іх разгляду і не даў адказу ва ўстаноўленыя тэрміны. «Бюракратычны па змесце адказ-адпіска старшыні гарсавета Івана Барадзінчыка, падрыхтаваны ім «па даручэнні дэпутатаў», не мае ніякага дачынення да сутнасці і прадмета нашых пісьмовых калектыўных зваротаў і ніяк не вынікае з пастаўленых у іх іншых пытанняў», — піша ў скарзе Аксёнаў.

Ён просіць разгледзець скаргу на пасяджэнні пастаяннай камісіі з яго непасрэдным удзелам, абавязаць дэпутатаў асабіста пісьмова адказаць грамадзянам на прапановы і прыняць меры для іх разгляду.

Аксёнаў указвае, што 23 дэпутаты праводзяць прыём выбаршчыкаў у працоўны час — з 14.00 да 17.00, калі большасць выбаршчыкаў працуюць, а 18 дэпутатаў — кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый — праводзяць прыём у працоўны час у сваіх кабінетах на працоўных месцах.

**Паводле інфармацыі кампаніі «Наш дом»**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЯКІМ БОКАМ НАМ ВЫЛЕЗЕ БАКІЕЎ?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Падзеі ў далёкім Кыргызстане бокам вылазяць беларусам. У міжнацыянальным канфлікце, які адбыўся ў Ошы і Джалал-Абадскай вобласці, загінула некалькі соцень чалавек. Здавалася б, пры чым тут Беларусь, дзе нацыянальных канфліктаў ніколі не было? Аказваецца, што пры чым. І прычына тут адна — знаходжанне на тэрыторыі краіны скінутага прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева.**

Адхілены ад улады прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў 14 чэрвеня даў у Мінску прэс-канферэнцыю ў сувязі з беспарадкамі на поўдні краіны, што прывялі да шматлікіх ахвяраў. «Сённяшнія члены ўрада, кіраўнікі мясцовых органаў улады абсалютна не кантралююць сітуацыю і не ведаюць, што рабіць. Калі б яны кантралявалі сітуацыю, то вось гэтага дапусціць не маглі б», — як чорцік з каробачкі выскачыў Бакіеў. Пры гэтым ён адзначыў: «Інфармацыяй валодаю прыкладна такой жа, як і вы (журналісты), праз даступныя сродкі, ну, можа быць, маю некалькі тэлефонных гутарак з асобнымі членамі парламента, хаця яны ўсе ва ўцёках — сёння часовы ўрад абвінавачвае мяне, членаў маёй сям'і ў тым, што адбылося».

Цікава, як чалавек, які не валодае інфармацыяй, можа даваць нейкую ацэнку падзеям на поўдні Кыргызстана, нават калі ён і быў прэзідэнтам гэтай краіны. Канешне, ён можа больш ведаць менталітэт свайго народа: тым больш, што адчуў яго на ўласнай скуры, падчас свайго звяржэння. Але ж, не валодаючы інфармацыяй, казаць пра тое, як урэгуляваць сітуацыю ў далёкай нам краіне, наўрад ці варта.

Безумоўна, кожны чалавек мае права на свае меркаванне. Тым не менш, Бакіеву варта было б прамаўчаць. Бо ўсе ягоныя словы могуць быць скарыстаныя супраць яго. Гэту прэсавую канферэнцыю можна расцэньваць як спробу Бакіева паўплываць на сітуацыю ў Кыргызстане, тым больш, што так яно і ёсць. Але паўстае заканамернае пытанне, з якой мэтай паўплываць на сітуацыю? Сапраўды стабілізаваць канфлікт альбо даць сігнал сваім прыхільнікам пра тое, што сам Бакіеў здавацца не збіраецца? І ці не стане заява Бакіева спробай патушыць пажар бензінам?

А крайняй апынецца, між іншым, Беларусь, якая прадставіла Бакіеву прытулак.

Больш за тое, днямі стала вядома, што ў Лонданскім аэрапорце затрыманы сын Бакіева Максім. Зараз разглядаецца пытанне ягонай экстрадыцыі ў Кыргызстан. Амаль адначасова з гэтай навіной стала вядома, што Генеральнай пракуратурай Беларусі пакінуты без задавальнення запыт Генпракуратуры Кыргызстана аб выдачы Бакіева.

І тут паўстае шмат юрыдычных пытанняў. 4 мая кіраўнік часовага ўрада Кыргызстана Роза Атунбаева падпісала дэкрэт аб пазбаўленні Бакіева прэзідэнцкай недатыкальнасці на падставе крымінальнай справы, па якой ён абвінавачваецца ў арганізацыі забойстваў і злоўжыванні службовым становішчам.

У агульнакрымінальнай практыцы на тэрыторыі СНД пытанне аб экстрадыцыі вырашаецца на падставе Мінскай канвенцыі 1993 года аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах. Калі грамадзянін нейкай дзяржавы ўчыніў на яе тэрыторыі злачынства і схаваўся ў Беларусі, то беларускія ўлады абавязаныя выдаць яго боку, які запытвае.

У той жа час, у адпаведнасці з міжнароднымі нормамі і нацыянальным заканадаўствам, Беларусь не выдае сваіх грамадзян. Не выдаць абвінавачванага Мінск можа таксама ў выпадку прадстаўлення яму палітычнага прытулку — дзяржава бярэ чалавека пад сваю абарону, і яму няма неабходнасці нават уваходзіць у беларускае грамадзянства.

23 красавіка, на сваёй першай прэс-канферэнцыі ў Мінску, Бакіеў заявіў, што не збіраецца прасіць палітычны прытулак у Беларусі. Пазней, размаўляючы з журналістамі, ён паведаміў, што не збіраецца вяртацца на радзіму і хоча прыносіць карысць Беларусі, якая дала яму прытулак.

Дык хто ж Бакіеў у Беларусі? Палітычны ўцякач? Ужо грамадзянін Беларусі? На якой падставе беларуская Генпракуратура адмовіла ў выдачы? Гэта пытанне дагэтуль не мае адказу. Калі і надалей не займее — Беларусь можа атрымаць абвінавачанне ў хаванні крымінальнага злачынцы (калі так вырашыць суд Кыргызстана) і парушэнні міжнародных нормаў і канвенцый аб выдачы злачынцаў.

Карацей, ад Бакіева беларускім уладам — толькі адзін галаўны боль, і больш ніякай карысці.

Апроч таго, у нас сваіх праблемаў хапае. У аўторак персанальна Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што Расія дае Беларусі пяць дзён для таго, каб вызначыцца з аплатай доўгу за расійскі газ. Пра гэта ён сказаў на сустрэчы з кіраўніком ААТ «Газпрам» Аляксеем Мілерам.

«Калі гэтага зроблена не будзе, тады давядзецца прымяняць строгі меры», — сказаў прэзідэнт Расіі. І зазначыў, што пытанне ліквідацыі запазычанасці беларускага боку перад «Газпрамам» за газ ён абмяркоўваў на нядаўняй сустрэчы з Лукашэнкам. «Я размаўляў з Аляксандрам Рыгоравічам, ён сказаў, што гэта (сітуацыя з запазычанасцю) вызначаецца цяжкім фінансавым становішчам, але, калі шчыра, зараз усім цяжка, і ў «Газпрама» шмат праблем. Таму, на жаль, гэта недастатковае тлумачэнне», — заявіў Мядзведзеў.

А Мілер наўпрост сказаў, што «Газпрам» сёлета поўнасцю аплаціў 50-працэнтную долю «Белтрансгаза», — быў аплачаны апошні транш на суму 625 мільёнаў долараў. «Так што беларускі бок мае фінансавыя рэсурсы для аплаты расійскага газу», — дадаў ён.

Традыцыйная «газавая вайна» Беларусі і Расіі сёлета можа пачацца не традыцыйна пад Новы год, а значна раней. Добры «падаруначак» ад саюзніка напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў! Калі так яно і здарыцца, то гэта зноў дасць падставу шматлікім аналітыкам заявіць, што Аляксандр Лукашэнка Крамлю ўжо надакучыў, і Масква не збіраецца падтрымліваць яго на прэзідэнцкіх выбарах.

Такім чынам, беларускі правадыр зараз можа разлічваць толькі на ўнутраныя рэсурсы і… панічна баяцца «кыргызскага варыянту». На нарадзе па пытаннях удасканальвання працы міжведамасных дзяржаўных органаў сістэмы арганізацыі бяспекі Беларусі, якая адбылася на базе Групы «А» КДБ («Альфа») Лукашэнка заявіў, што неабходна павысіць эфектыўнасць сістэмы рэагавання на экстрэмісцкія дзеянні. «Радыкальныя сілы ў якасці сродку дасягнення сваіх палітычных мэтаў як у глабальным маштабе, так і на рэгіянальных узроўнях няродка бяруць на ўзбраенне крывавыя экстрэмісцкія метады». «Гэта зло, што імкліва распаўзаецца па планеце, сёння шчыльна падышло да межаў нашай дзяржавы. Мы не маем права аслабляць увагу да такіх пагроз бяспецы людзей, спадзеючыся на стабільнасць сацыяльна-палітычнага становішча ў Беларусі», — сказаў Лукашэнка.

Не нагадвае паралеляў з заявай Бакіева пра «кантроль сітуацыі» і «бяспеку людзей»?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ВАДЗІМ ДЗЕВЯТОЎСКІ І ІВАН ЦІХАН



Беларускія атлеты Вадзім Дзевятоўскі і Іван Ціхан вярнулі сабе медалі Алімпіяды–2008. Міжнародны арбітражны суд CAS зняў усё абвінавачванні на адрас малатабойцаў Дзевятоўскага і Ціхана, звязаныя з ужываннем допінгу на Алімпіядзе–2008 у Пекіне. Справа доўжылася 19 месяцаў.

На Алімпіядзе ў Пекіне Вадзім Дзевятоўскі і Іван Ціхан заваявалі срэбны і бронзавы медалі адпаведна. Аднак ужо праз некалькі месяцаў, у снежні 2008 года, Міжнародны алімпійскі камітэт абвясціў пра станоўчыя допінг-пробы беларускіх атлетаў і прыняў рашэнне наконт дыскваліфікацыі спартоўцаў. Івану Ціхану пагражала двухгадовая дыскваліфікацыя, Вадзіму Дзевятоўскаму — пажыццёвая. Акрамя таго, у іх адабралі алімпійскія медалі, заваяваныя ў Пекіне. Атлеты падалі пратэст, але нямногія верылі, што вышэйшая інстанцыя, якой з'яўляецца Міжнародны арбітражны суд, прызнае памылку МАК.

Вяртанне алімпійскіх медалёў каштавала каля 500 тысяч долараў. «На суды выдаткавана прыкладна паўмільёна долараў. Дзве справы былі абсалютна розныя, але — парадокс — аналізы вельмі падобныя, у тым ліку па канцэнтрацыі тэстастэрону. Важна, што нам аказвалі дапамогу. Дзякуй тым людзям, якія паверылі нам. Гэта справа паказала, што беларусы, аб'яднаўшыся, уяўляюць вялікую сілу. Салідарнасць многага вартая», — сказаў Вадзім Дзевятоўскі. Паводле рашэння арбітражнага суда, атлетам павінны пакрыць шкоду ў памеры 50 тысяч еўра.

Узгадваючы тыя падзеі, срэбны прызёр Алімпійскіх гульняў адзначыў, што спачатку не збіраўся аддаваць заваяванае срэбра (па рашэнні МАК трэба было вярнуць медалі неадкладна), але, каб пазбегнуць санкцый, у тым ліку для Беларусі, прывёз медаль у Нацыянальны алімпійскі камітэт, дзе ён зараз і знаходзіцца.



### ЯЎГЕН ЯКАВЕНКА

Праваабаронцы кваліфікуюць чарговы абвінаваўчы прысуд за ўхіленне ад прызыву на воінскую службу як палітычна матываваны. Справа тычыцца актывіста аргкамітэта па стварэнню партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя Яўгена Якавенкі. Суд Цэнтральнага раёна Гомеля асудзіў да года абмежавання волі Яўгена Якавенку за ўхіленне ад прызыву на воінскую службу. На падставе Канстытуцыі, паводле якой беларуская і руская мовы маюць у краіне дзяржаўны статус, Якавенка патрабаваў кантактаваць ім па-беларуску і адмаўляўся браць рускамоўныя позвы.

«Мы прыйшлі да высновы, што Якавенка асуджаны з-за сваіх перакананняў, — заявіў БелаПАН праваабаронца Валянцін Стэфановіч. — Ён неаднаразова пісьмова звяртаўся ў ваенкамат, каб яму далі магчымасць прайсці альтэрнатыўную службу з пацыфісцкіх перакананняў. Суд Цэнтральнага раёна Гомеля, дзе праходзіў працэс, прысвяціў высвятленню яго пацыфісцкіх перакананняў амаль цэлы дзень. Аднак, калі паглядзець на прысуд, ніякай адзнакі гэтым перакананням суд не даў. Ды і пра альтэрнатыўную службу ў прысудзе сказана толькі мімаходзь».

Па словах праваабаронцы, калі разглядаць дадзены прысуд з пункта гледзішча міжнародных стандартаў, то чалавек мае права патрабаваць адбывання альтэрнатыўнай службы па перакананнях сумлення.

### ПАВЕЛ РУДЗЕНЯ



Сляпы дыджэй з Мінска Павел Рудзеня атрымаў прэстыжную міжнародную прафесійную прэмію ў галіне рускамоўнага радыёвяшчання (прэмія Папова). Урачыстая цырымонія абвяшчэння лаўрэатаў прайшла ў Сан-Францыска. Вяршыні радыйнага алімпу скарылі стваральнікі наваградняга праекту «12 месяцаў» службы інфармацыі беларускай радыёстанцыі «Юністар» у намінацыі «Лепшая інфармацыйная праграма». А ў адмысловай намінацыі «За любоў да радыё» перамог мінчук Павел Рудзеня — дыджэй «Мясцовага радыё», — піша «Народная воля». Хлопец не бачыць з дзяцінства, аднак вядзе актыўны лад жыцця і двойчы на суткі выходзіць у прамы эфір на Першым нацыянальным канале беларускага радыё. Вяшчае «Мясцовае радыё» ў сталічным раёне Курасоўшчына.

Гэта перамога — самая галоўная для мяне неспадзяванка і падарунак, — распавядае Павел Рудзеня. — Калі даведаўся пра тое, што журы нас адзначыла, не змог стрымаць слёз. Ды што ўжо гаварыць — раўлі ўсім калектывам! Бо да гэтай перамогі мы ішлі не адзін год, адсылалі заяўкі некалькі разоў. Вельмі хачу, каб неўзабаве спраўдзілася і другая запаветная мара — працаваць на прафесійнай радыёстанцыі. А пакуль буду працягваць выходзіць у эфіры на сваім «Мясцовым радыё».

▸ ТРЭЦІ СЕКТАР

# УЛАДЗІМІР КОЛАС

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Нарыс пра Уладзіміра Коласа пісаўся ў той момант, калі вакол Рады беларускай інтэлігенцыі ўзнікла моцная інфармацыйная хваля з-за спробы дапамагчы апазіцыйным палітыкам абраць адзінага кандыдата ў прэзідэнты. Не хачу займаць чыйсьці канкрэтны бок, бо гэта «хлеб палітолагаў». Скажу толькі, што калі палітыкай пачынаюць займацца не інтэлігентна, то інтэлігенцыя час ад часу сама пачынае займацца палітыкамі.**

## З чаго пачыналася бацькаўшчына і кіно

Уладзімір Колас нарадзіўся 22 верасня 1951 года ў Мінску. Яго бацькі — Георгій Данілавіч і Алена Паўлаўна — на той час былі студэнтамі тэатральна-мастацкага інстытута. Маці стала тэлевізійным рэжысёрам, а бацька — тэатральным крытыкам.

Цікавы момант. Валодзіна бабуля, Марыя Емяльянаўна, працавала галоўным бухгалтарам у Доме ўрада і, паколькі пакінуць унука не было з кім, часта брала яго на працу. Там незнаёмая жанчына адводзіла хлопчыка ў нейкі пакой, дзе былі чырвоныя скрыначкі з узнагародамі — зоркі Героя Савецкага Саюза, розныя ордэны і медалі. З гэтымі «цацкамі» ён і гуляў.

Яшчэ ў школьныя гады Уладзімір Колас займаўся ў аматарскай кінастудыі «Юнацтва» пры Палацы прафсаюзаў. Потым яе кіраўнік Аляксандр Сабатаж, які працаваў аператарам на тэлебачанні, перайшоў у Інстытут замежных моваў, дзе была «Лабараторыя кіно». Яна мела прафесійную кінакамеру, што і вырашыла далейшы выбар шляху Коласа. Аднак па той прычыне, што ў знакаміты ВГИК адразу пасля школы не бралі, Уладзімір вырашыў паступаць у інстытут замежных моваў. Планаваў правучыцца гады тры, аднак дайшоў да дыплома. Першай у яго была мова французская, другой — англійская. Па размеркаванню Колас паўтары гады настаўнічаў у Браслаўскім і Чашніцкім (в. Углё) раёнах. Потым тры гады адслужыў у Белпалку.

І толькі пасля паступіў на Вышэйшыя рэжысёрскія курсы ў Маскве. Там яго і пачала хваляваць праблема тоеснасці беларусаў у былым Савецкім Саюзе. Кожную савецкую рэспубліку, альбо кінастудыю, «прадстаўлялі» па 2–3 чалавека, і менавіта ў Маскве ён убачыў: СССР — азіяцкая краіна. Амаль усе «славянскія» кінастудыі прадстаўлялі ўраджэнцы Азіі.

На тым жа «Беларусьфільме» працавалі прадстаўнікі ўсяго Савецкага Саюза. Як у той песні — «мой адрас не дом і не вуліца». Некаторым было цалкам «пляваць», дзе яны знаходзяцца. Ні мовы, ні гісторыі яны ведаць не хацелі. Адтуль ідзе перакананне Уладзіміра Коласа, што кіно і тэлебачанне — гэта ёсць тое, што павінна ствараць моду на беларушчыну.

Дарэчы, яго дыпломнай работай быў «Малады дубок» па Якубу Коласу. А дэбютам — «Багровая трава» па сцэнару Аляксея Дударава. Фільм быў прызнаны лепшым у былым СССР, і Уладзімір Колас атрымаў свой першы прыз. Далей ішлі «Дрэва на асфальце» з Галінай Макаравай у галоўнай ролі і «Хочаце ляпіце, хочаце не». Потым Колас зняў «Адну ноч» па Васілю Быкаву і шмат дакументальных фільмаў.

У 2008 годзе на прэстыжным Берлінскім кінафестывалі, у якім бяруць удзел амаль усе галоўныя тэлеканалы Еўропы, з карцінай «Галерэя Ады», дзе расказваецца пра маленькую беларускую вёску, Уладзімір Колас атрымаў «Прыз Еўропы» за лепшы дакументальны фільм.

## З чаго пачынаўся ліцэй

Неабходнасць паспрыяць падрыхтоўцы сваіх кадраў стала для Уладзіміра Коласа своеасаблівым штуршком для рашучых перамен ва ўласным лёсе. Паспрыялі таму і супраца з такімі кансультантамі ў яго карцінах, як археолаг Алег Трусаў, пісьменнік Эрнэст Ялугін — энтузіястамі нацыянальнага адраджэння. А таксама наведванне беларускіх школ і ліцэя на Беласточчыне, дзе Колас здымаў фільм пра праблемы беларускай мовы.

Непасрэдная ж прапанова стварыць беларускі ліцэй у Мінску паступіла ад Алега Трусава, якому Колас дапамагаў у яго выбарчай кампаніі ў Вярхоўны савет 12-га склікання. Ужо дэпутат Трусаў (і ён жа старшыня адной з раённых суполак Таварыства беларускай мовы) абяцаў яму поўную падтрымку.

Так узнік ЛІЦЭЙ. Нягледзячы на тое, што навучанне было платным, ахвочых навучацца ў ім аказалася многа. І не толькі дзяцей. Было некалькі груп дарослых. Лекцыі выкладчыкаў прыходзілі слухаць нават тыя, хто і сам быў аўтарытэтным спецыялістам у сваёй галіне. Тая ж доктар навук Высоцкая з мастацкага музея.

Потым былі пошукі памяшкання, пакуты па розных «чужых кутах». Коласу нават прапаноўвалі зрабіць звычайную беларускамоўную школу, стаць яе дырэктарам. На ўздыме дэмакратычнай хвалі пачатку 1990-х гадоў гэта было цалкам рэальна і нашмат прасцей. «Павесіш, — раілі яму, — на школе шыльду «ліцэй», і ўсё будзе добра». Ён цвёрда трымаўся іншай канцэпцыі — вучні і выкладчыкі набіраюцца па конкурсу. Зразумела, што на гэта калектывы ні адной са школ не ішлі. Нарэшце, пасля дастатковa працяглай эпапеі, Колас з паплечнікамі дамагліся свайго: улады вызначылі пад ліцэй шыкоўны будынак былой камсамольскай школы на Кірава, 21. Было гэта ў 1992 годзе.

А з 1994 года пачаўся ціск. Уладзіміру Коласу паказалі ўказ (адзін з першых новай улады), які загадваў знішчыць усе падручнікі, што былі выдадзены пасля 1991 года. У 1997 годзе, калі на пасадзе віцэ-прэм'ера знаходзіўся сумна вядомы палкоўнік Замяталін, ліцэй быў перайменаваны ў Нацыянальны дзяржаўны ліцэй імя Якуба Коласа. За іроніяй Колас — дырэктар ліцэя Коласа (хаця Уладзімір Колас заўсёды казаў, што, у адрозненне ад знакамітага паэта, у яго не псеўданім, а сапраўднае прозвішча) хавалася мэта ўзяць ліцэй пад поўны кантроль, выдаліць разам са словам «беларускі» з назвы яго вольналюбівы адраджэнскі змест.

Ліквідавалі ліцэй указам Міністэрства адукацыі РБ ад 25 чэрвеня 2003 года. З фармулёўкай — «ліквідаваць з мэтай аптымізацыі навучальнага працэсу». Прагучала абяцанне ў тым жа будынку адкрыць «новы гарадскі ліцэй». Прычапіліся да таго, што ліцэй быццам бы не можа быць нацыянальным і ... звольнілі ўсіх. Нават вахцёра.

Парадокс, але атрымліваецца, што ўлады закрылі іх за сваю ж памылку, і з гэтага часу ліцэй працуе падпольна. У будынку на Кірава месціцца суд Савецкага раёна Мінска, дзе сярод іншых судзяць былых вучняў ліцэя. «Аптымізавалі»…

## З чаго пачыналася рада

Далейшыя падзеі прымусілі падумаць пра неабходнасць нешта рабіць, заняць актыўную пазіцыю, а не стаяць у баку. Стала відавочна: калі ніхто не будзе «рухацца», то беларусы заслугоўваюць таго, што з імі будзе далей, бо асабіста Колас ніколі не мог зразумець, чаму нашы продкі дазволілі падчас рэпрэсіяў так сябе катаваць. Гэта і стала «каталізатарам» стварэння Рады беларускай інтэлігенцыі (РБІ).



Уладзімір Колас

У маі 2003 года ў Палацы мастацтваў адбыўся гарадскі сход, а потым у Доме культуры ААТ «Сукно» — нацыянальны. Галоўны пасыл — кансалідацыя. Удзельнікі звярнуліся да ўлады, апазіцыі і народа з заклікам шукаць тое, што нас яднае, а не раз'ядноўвае, будаваць разам дэмакратычнае грамадства. І добразычлівым лістом накіравалі гэтыя прапановы прэзідэнту краіны.

Неўзабаве пасля гэтага Лукашэнка выступіў на нарадзе вышэйшых кіруючых кадраў у канцэртнай зале «Мінск» з прамовай. Працытаваў Уладзіміра Коласа, але са сваёй высновай. Маўляў, інтэлігенцыя імкнецца раскалоць грамадства на розныя тыпы беларусаў, хаця гутарка ішла пра супрацьлеглае. І ўпершыню абвясціў пра неабходнасць стварэння дзяржаўнай ідэалогіі. Ніколі не ведаеш, да якіх наступстваў прывядзе тое, што ты робіш…

## З чаго пачнецца «адзіны»

Тое, што ў 2005 годзе ў беларускай апазіцыі другі раз запар на прэзідэнцкіх выбарах быў адзіны кандыдат — заслуга шмат каго. У тым ліку і Рады беларускай інтэлігенцыі. Іншая справа — механізм яго вылучэння і вынікі дзейнасці.

Менавіта гэта і выклікае пытанні, бо зараз мы відавочна паўтараем памылкі мінулага. І можам дадаць новыя. Адна з іх — колькасць патэнцыйных «калон». Цалкам згодны з тымі, хто жартуе наконт таго, што колькасць жадаючых стаць прэзідэнтам хутка будзе больш за колькасць выбаршчыкаў.

Ведаю, што многія даволі жорстка крытыкуюць РБІ за спробы нешта вырашыць. Маўляў, не справа «трэцяга сектару» займацца такімі глабальнымі рэчамі. Часткова згодны, але толькі ў тым выпадку, калі няма такой патрэбы. На жаль, сёння яна ёсць.

На думку Уладзіміра Коласа, неабходны разумны баланс паміж палітыкамі і грамадскай супольнасцю. Тандэм, а не спробы паказаць, хто больш «круты».

За апошнія месяцы на пасяджэннях Рады беларускай інтэлігенцыі пабывала больш за 15 чалавек. Зразумела, не толькі прэтэндэнтаў на «скуру незабітага мядзведзя», але і тых, хто можа на нешта паўплываць. Усе пагадзіліся, што перамагчы можа толькі «адзіны». Аднак усе лічаць — яго не будзе ніколі. Чаму? «Таму, што мы такія!»

Магчыма, гэта выглядае крыху пафасна, але, на мой погляд, Уладзімір Колас і працуе дзеля таго, каб падобныя адказы не гучалі ніколі.




Дзе быў ліцэй, там сёння суд. Здымак 01.09.2006 г.

ВАЯЖ

# КАНАДА — АДКРЫЦЦЁ ДЛЯ АПАЗІЦЫІ

Генадзь КЕСНЕР

**«У выпадку прыходу да ўлады беларускіх дэмакратычных сіл Канада гатова стаць лакаматывам інтэграцыі Беларусі ў сусветную эканоміку». Гэтыя словы канадскага прэм'ер-міністра Стывена Харпера працытаваў лідэр кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў на прэс-канферэнцыі па выніках візіту ў ЗША і Канаду прадстаўнікоў беларускага дэмакратычнага руху.**



Фота аўтара

Анатоль Лябедзька, Яраслаў Раманчук, Уладзімір Някляеў

На мінулым тыдні Атаву і Вашынгтон, апроч Уладзіміра Някляева, наведалі Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, яго намеснік Яраслаў Раманчук, а таксама міжнародны сакратар АГП Андрэй Дзмітрыеў.

Удзельнікі паездкі выказалі агульнае задавальненне вынікамі візіту. «Мэты і задачы, якія ставіліся перад гэтай паездкай, дасягнуты на сто працэнтаў, а ў нечым нават пераўзышлі нашы папярэднія чаканні, — адзначыў Анатоль Лябедзька. — Што датычыць Канады, то мы адкрылі для сябе вельмі перспектыўную краіну. Не буду казаць за ўсю апазіцыю, за ўсю грамадзянскую супольнасць, але для Аб'яднанай грамадзянскай партыі Канада — такі ж самы прыярытэт, як і Еўрапейскі Саюз, і Злучаныя Штаты Амерыкі... Канада не завязана на пэўныя чыннікі, як Еўрапейскі Саюз, у якога энергетычная залежнасць у фармаце еўраазіяцкай прасторы. Прэм'ер-міністр Харпер — вельмі цікавая асоба, самадастатковы як палітык, і ў яго сёння ёсць вялікая матывацыя выходзіць за межы самой Канады. Менавіта гэтым і можна патлумачыць, што ён пайшоў на сустрэчу з намі. Канада — краіна вельмі перспектыўная, яна ўваходзіць у дзесятку дзяржаў з наймацнейшым эканамічным патэнцыялам, у бліжэйшы час там пройдзе саміт "Дваццаткі", і гэта азначае, што ў Канады таксама велізарны палітычны патэнцыял».

Як паведаміў Анатоль Лябедзька, таксама адбыліся асобныя сустрэчы з чатырма федэральнымі міністрамі Канады, са спікерам, з кіраўніком камісіі па міжнародных сувязях, з дэпутатамі парламента, сенатарамі, якія, па словах палітыка, выявілі вялікую зацікаўленасць у сустрэчы з беларускай дэлегацыяй.

У Вашынгтоне беларускія палітыкі сустрэліся са старшынёй Хельсінскага камітэта Кангрэса ЗША Элсі Хастынгсам, кангрэсменам Крыстаферам Смітам, а таксама з сенатарам Джонам Макейнам, які быў супернікам Барака Абамы на мінулых прэзідэнцкіх выбарах. Па словах Анатоля Лябедзькі, сенатар-рэспубліканец падтрымаў формулу беларускіх апазіцыянераў «крэдыты ў абмен на свабодныя выбары». Як паведаміў кіраўнік АГП, Джон Макейн паабяцаў, што будзе звязвацца з кіраўніцтвам найбуйнейшых фондаў дзеля садзеяння ў рэалізацыі гэтай формулы.

Паводле сцвярджэння Анатоля Лябедзькі, кангрэсмен Крыстафер Сміт пагадзіўся з ідэяй правядзення слуханняў па сітуацыі ў Беларусі не толькі ў межах кангрэсаўскага Хельсінскага камітэта.

Яраслаў Раманчук адзначыў, што ў Канадзе дасягнутая дамоўленасць аб правядзенні ў Мінску пры канцы верасня — на пачатку кастрычніка бягучага года буйнога эканамічна-інвестыцыйнага форума, на які мяркуецца запрасіць канадскіх эканамістаў-рэфарматараў.

Уладзімір Някляеў паведаміў, што асаблівая ўвага падчас усіх сустрэч у ЗША і Канадзе надавалася сітуацыі, якая склалася ў Беларусі са СМІ і з інтэрнэтам. Паводле лідэра кампаніі «Гавары праўду!», удзельнікі сустрэч з беларускага боку настойвалі на падтрымцы незалежных мас-медыя, тых грамадска-палітычных выданняў, якія яшчэ засталіся ў краіне.

«Нам патрэбна інфармацыя, усё астатняе мы здольны зрабіць самі. Тое, у чым мы абмежаваны, — гэта эфектыўна данесці да людзей, што можа быць у Беларусі, калі яны пойдуць на выбары за змены, а не наадварот. Амерыканскія і канадскія палітыкі не могуць не ўлічваць тую сітуацыю, якая склалася ў нас з газетамі, з усімі СМІ, з нападамі на інтэрнэт. У іх свядомасці ўсё гэта не стасуецца са здаровым сэнсам, і яны паабяцалі зрабіць усё, каб не дапусціць кітаізацыі становішча ў Беларусі, што да пытанняў інтэрнэта і сродкаў масавай інфармацыі», — адзначыў Уладзімір Някляеў.

Падчас наведвання ЗША і Канады Анатоль Лябедзька, Яраслаў Раманчук і Уладзімір Някляеў сустрэліся з прадстаўнікамі беларускай дыяспары паўночна-амерыканскага рэгіёну, у тым ліку і са старшынёй Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонкай Сурвілай.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# БАКІЕЎ УПАДАБАЎ БЕЛАРУСЬ

Генадзь КЕСНЕР

**Бліжэй да вечара 14 чэрвеня журналістаў зноў «паставілі на вушы» — супрацоўнікі Нацыянальнага прэс-цэнтра Беларусі абзваньвалі СМІ з паведамленнем, што ў 18.00 адбудзецца тэрміновая прэс-канферэнцыя адсунутага ад улады прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева. Улічваючы трагічную і непрадказальную сітуацыю, якая складваецца ў гэтай краіне, журналісты беларускіх і замежных медыя пакідалі ўсе бягучыя справы (хтосьці нават ужо паспеў дабрацца дадому) і шыбанулі на Кастрычніцкую, 5.**

Курманбека Бакіева і зараз прымаюць у Беларусі як прэзідэнта Кыргызстана з усімі адпаведнымі атрыбутамі: перад тым, як трапіць у канферэнцзалу НПЦ, усіх дасканала праверылі супрацоўнікі Службы бяспекі беларускага кіраўніка, а сам спадар Бакіеў сядзеў за сталом побач з дзяржаўным сцягам краіны, у якой ён зусім яшчэ нядаўна валадарыў.

Ад самага пачатку прамоўца падкрэсліў, што яшчэ некалькі дзён таму ён заклікаў народы Кыргызстану да замірэння, да спынення гвалту і кровапраліцця, якое не ў стане спыніць цяперашняе кіраўніцтва краіны.

Паводле словаў Бакіева, у краіне працягваецца «гвалт, запалохванне, крымінальны пераслед былых урадаўцаў, парламентарыяў, іншых чыноўнікаў, а таксама іх сваякоў».

Выхад з сітуацыі Курманбек Бакіеў бачыць у дапамозе (чытай: вайсковай) з боку краін-удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы: «Хацелася б яшчэ раз звярнуцца да кіраўніцтва дзяржаў-удзельніц АДКБ з заклікам больш аператыўна і адэкватна адрэагаваць на сітуацыю ў Кыргызстане і дапамагчы народам, якія пражываюць у гэтай краіне, аднавіць законнасць і парадак». Па словах скінутага прэзідэнта, «праваахоўныя органы, сілавыя структуры Кыргызстана цалкам дэмаралізаваныя, яны не могуць нічога зрабіць».

«Як у такой сітуацыі можна забяспечыць бяспеку грамадзян?» — задаўся пытаннем Курманбек Бакіеў. Пры гэтым ён адмёў усе абвінавачанні ў тым, што да беспарадкаў і кровапраліцця ў Кыргызстане маюць дачыненне ён і яго сваякі. Па словах Бакіева, зараз яго «сыны, як і браты, знаходзяцца ў розных краінах ва ўцёках».




Фота аўтара

Курманбек Бакіеў

Бакіеў лічыць, што канфлікт на поўдні краіны паміж кіргізамі і ўзбекамі распаліўся не на палітычнай, але на побытавай глебе. «У нейкім казіно ў Ошы паміж маладымі хлопцамі кіргізскай і ўзбекскай нацыянальнасцяў адбылася сварка. Замест таго, каб хутка зрэагаваць на гэту сварку і пагасіць яе, мясцовыя органы нічога не зрабілі. Таму валіць з хворай галавы на здаровую не варта. Ім варта спыніць валіць усё на мяне, на маіх блізкіх і на ўсё папярэдне кіраўніцтва», — параіў апальны дзяржаўны дзеяч.

Па словах Бакіева, ён не збіраецца больш займацца палітыкай і вяртаца на радзіму, хоць і даў зразумець, што па-ранейшаму юрыдычна застаецца кіраўніком дзяржавы. Ён нагадаў, што напісаў заяву аб адмаўленні ад сваёй пасады, але, па словах Бакіева, «і парламент, і Канстытуцыйны суд, і ўрад у краіне разагнаныя», таму няма легітымных структур, якія б маглі прыняць яго адстаўку. «Каб я юрыдычна склаў свае паўнамоцтвы, патрэбна рашэнне парламента... Але я хачу супакоіць тых, хто чакае, што я вярнуся: я не збіраюся вяртацца, я не трымаюся за гэту ўладу», — заявіў звергнуты прэзідэнт.

Курманбек Бакіеў паведаміў, што звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай аказаць гуманітарную дапамогу «не часоваму ўраду, але народу Кыргызстана», якому «пагражае голад».

Адказваючы на пытанне журналістаў наконт «прымянення сваіх сіл» (на папярэдняй прэс-канферэнцыі Бакіеў заявіў, што паспрабуе быць карысным Беларусі і яе кіраўніцтву), экс-прэзідэнт Кыргызстана сказаў, што пакуль не ведае дакладна, чым будзе займацца надалей, як і не ведае, колькі часу правядзе ў Беларусі. Калі давядзецца шукаць прымянення сваім сілам, то, найхутчэй, ён пойдзе ў галіну вытворчасці, бо «ведае яе і прыйшоў адтуль». А пакуль, па словах Бакіева, ён «не гарыць жаданнем займацца нейкай канкрэтнай справай», бо яго «клапоціць сітуацыя ў Кыргызстане».

Курманбек Бакіеў абверг чуткі пра свой нядаўні адпачынак у Турцыі: «За апошні час я нікуды не выязджаў з Беларусі, з самых першых дзён я знаходжуся тут. Я толькі выязджаў у горад (Мінск — Г. К.)... Мне тут усё падабаецца, і прырода таксама, вось толькі дажджоў шмат».

ЭКАЛОГІЯ

# ДАПАМОГА ЗЯЛЁНАМУ ТУРЫЗМУ

Вольга ХВОІН

**На Віцебшчыне, у Наваполацку і вёсцы Забор'е Расонскага раёна адкрытыя два інфармацыйныя цэнтры, створаныя ў межах сумеснага праекту Еўрапейскага саюза і ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». З дапамогай гэтых цэнтраў мясцовыя ўлады плануюць павялічыць колькасць турыстаў у рэгіёне, а таксама заахвоціць мясцовае насельніцтва да ўдзелу ў экалагічных праграмах.**

Па задуме стваральнікаў, інфармацыйныя цэнтры будуць своеасаблівымі акумулятарамі інфармацыі пра турыстычны патэнцыял Віцебшчыны, на іх базе плануецца праводзіць адукацыйныя мерапрыемствы, апроч таго, праз цэнтры будзе ажыццяўляцца падтрымка рэгіёнам, на тэрыторыі якіх пачнуць стварацца зялёныя маршруты.

Адкрываючы інфацэнтр у Наваполацку, прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі Антоніус Брук зазначыў, што «праект з'яўляецца вынікам сумесных намаганняў: ЕС, ПРААН, Мінпрыроды, мясцовых органаў улады і жыхароў горада». Агульны бюджэт праекту складае 1,3 мільёна долараў. Гэтыя сродкі будуць накіраваныя на дзейнасць у сферы ўстойлівага развіцця ў 35 беларускіх раёнах. Спадар Брук падкрэсліў, што ў дадзеным выпадку важныя не толькі грошы, але і жаданне ствараць новыя падыходы да кіравання прыроднымі рэсурсамі.

«Гэта — інвестыцыі ў заўтрашні дзень, бо менавіта прынцыпы ўстойлівага развіцця, заснаваныя на рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, дазваляюць нам упэўнена глядзець у будучыню», — сказаў прадстаўнік ААН. Спонсары праграмы спадзяюцца, што на гэтым яна не затухне, а будзе развівацца, і найперш з жадання людзей, якія рэалізуюць праекты. «Нам часта задаюць пытанне, што Еўропа гатовая рабіць для Беларусі, але мне хацелася б запытацца ва ўсіх вас, што вы самі гатовыя зрабіць для Беларусі, бо яна ўжо ёсць часткай Еўропы», — дадаў спадар Антоніус Брук.

Чакаецца, што да канца года ў Беларусі пры дапамозе праекту ЕС/ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» будуць адкрытыя яшчэ тры аналагічных цэнтра — у Чавусах, Белаазёрску і Жалудку.

Рэалізацыя сумеснага праекту Праграмы развіцця ААН і Еўрапейскага саюза «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» пачалася ў Беларусі два гады таму. Летась у яго межах быў абвешчаны конкурс мясцовых ініцыятыў. Наваполацк прапанаваў да разгляду адразу некалькі праектаў, звязаных з развіццём экалагічнага турызму, экалагічнага патэнцыялу рэгіёна, а таксама з выхаваннем дзяцей: праекты так ці інакш завязаныя на вучняў мясцовых школ і гімназій. Да прыкладу, турыстычны экалагічны маршрут «Блакітныя каралі Расонаў» і «Полацкі Стоунхедж» — ініцыятывы, якія могуць быць цікавымі не толькі мясцовым жыхарам ці школьнікам, але і ўсім аматарам вандровак па Беларусі.



Фота Алены Садоўскай

Другі інфармацыйны цэнтр па ўстойлівым развіцці і агратурызму адкрыўся ў вёсцы Забор'е Расонскага раёна. Яго ўзначаліла дырэктарка дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Экоросы» Ала Хорань, якая да ўсяго з'яўляецца і адной з пачынальніц агратурызму на Расоншчыне. Цяпер тут пасяхова працуюць каля трыццаці аграсядзібаў. Раён не мае высокага прамысловага патэнцыялу, актыўнага земляробства. Амаль уся яго тэрыторыя пакрытая лясамі і азёрамі, таму стваральнікі інфармацыйнага цэнтра лічаць, што блізкасць да дзікай прыроды — гэта цымус раёна, і ім трэба карыстацца.

Да слова, у вёсцы Забор'е адкрыццё Інфацэнтра супала з правядзеннем рэспубліканскага фэсту сельскага турызму «Заборскі фэст», які сёлета атрымаў дадатковае фінансаванне з боку праекту ЕС/ПРААН.

СПАДЧЫНА

# СУПРАЦЬ ЛЮДЗЕЙ І ГІСТОРЫІ

Вольга ХВОІН

**У Мінску жыхары дамоў па вуліцы Рэвалюцыйнай змагаюцца супраць гарадскіх уладаў за сваю маёмасць і захаванне гістарычнай забудовы горада.**

Жыхарам дамоў 24 і 32 па вуліцы Рэвалюцыйнай пагражае адсяленне з кватэр, якія знаходзяцца ў іх прыватнай уласнасці. Дом, што з'яўляецца помнікам архітэктуры XIX стагоддзя, можа быць знішчаны, а на яго месцы пабудаваны новы камерцыйны аб'ект.

Дом па Рэвалюцыйнай, 32, адпаведна Пастановаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 верасня 2008 г. № 1288 і ад 19 жніўня 2009 г. № 1088, уваходзіць у склад комплекснай гісторыка-культурнай каштоўнасці міжнароднага значэння «Гістарычны цэнтр г. Мінска».

Таму на будынак у поўнай меры распаўсюджваецца дзеянне міжнародных і нацыянальных прававых актаў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Але цяпер побач з гістарычнымі дамамі ва ўсю ідзе будоўля шматфункцыянальнага комплексу з падземным паркінгам. Тут шчыруе тэхніка, будаўнікі забіваюць палі, а дамкі апынуліся бы на выспе ў атачэнні катлаванаў. Натуральна, гэта не найлепшым чынам паўплывала на іх стан. Гарадскія ўлады спрабуюць давесці жыхарам гістарычнага цэнтру, што іх жытло знаходзіцца ў аварыйным стане.

## Супраць такіх грошай вы — нішто

Жыхары дома па вуліцы Рэвалюцыйная, 32 пратэстуюць супраць рашэння гарадскіх уладаў і, каб адстаяць свае правы на маёмасць, нават звярнуліся ў суд. Падрыхтаваная і скарга ў пракуратуру на дзеянні КУП «Спадчына», у падпарадкаванні якога знаходзіцца забудова, з просьбай завесці крымінальную справу па факту знішчэння гістарычных помнікаў і культурнай спадчыны.



www.labadzenka.by

Цікава, што не так проста было знайсці адваката, які б пагадзіўся адстойваць іх інтарэсы, — людзі папросту баяцца звязвацца з гарадскімі ўладамі. «Нам так і сказалі падчас судовага пасяджэння: тут такія грошы задзейнічаныя, што вы ніякіх шанцаў не маеце, — расказвае жыхарка дома № 32 па вуліцы Рэвалюцыйнай Галіна Паўлаўна. — Прадстаўнік Мінгравыканкама нам гаварыў: «Ды што вы дзёргаецеся? Усё адно ў вас нічога не атрымаецца, бо супраць такіх грошай вы — нішто. Выселяць і выкінуць. Нам нават не прапанавалі два-тры варыянты. Прапанавалі адзін — і праз месяц у абавязковым парадку высяляйцеся».

За справу ўзялася адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Вераніка Варава. Яна гаворыць, што дзеянні гарадскіх уладаў супрацьпраўныя. «Тое, што тут адбываецца знішчэнне, ні для каго не сакрэт. Парушаны цэлы шэраг заканадаўчых нормаў. Гэта і Канстытуцыя Беларусі, і Жыллёвы кодэкс, і Грамадзянскі».

Жыхары старасвецкіх дамоў кажуць, што пагадзіліся б на адсяленне, калі б ведалі, што будынкі будуць захаваныя і, напрыклад, іх перададуць пад музеі ці архівы. Але, на жаль, гістарычную забудову чакае сумны лёс знішчэння.

«Я вельмі трапятліва стаўлюся да захавання гістарычных, культурнай спадчыны. І мне не падабаецца, што адбываецца цяпер: нягледзячы ні на што руйнуецца прыгажосць, а ўзводзяцца стандартныя шматфункцыянальныя комплексы. Напэўна, трэба думаць пра душу, пра тое, што людзям патрэбна нешта яшчэ, апроч шматфункцыянальных комплексаў і гандлёвых кропак, — разважае пра маральны аспект сваёй справы адвакат Вераніка Варава. — Людзі, якія тут жывуць, не прыносяць матэрыяльнай карысці ўладам. А будуць пабудаваныя гандлёвыя комплексы, і нешта з іх прыбытку перападзе ўладам горада. На жаль, паўсюль запраўляюць грошы».

Да слова, у 1986 годзе дом быў капітальна адрамантаваны: з 32-х кватэр зрабілі толькі 8, унутры ўсё памянялі, пакінулі толькі знешнія сцены. Кватэры тут насамрэч з добрым рамонтам, утульныя, таму пра занядбанасць гаворка не ідзе.

## Ашчаджэнне на спадчыне

Хвалююцца за лёс свайго дома і жыхары Рэвалюцыйнай, 24. Зрэшты, як яны гавораць, змаганне за маёмасць доўжыцца больш за 20 гадоў, і не дзіва — зямля ў гістарычным цэнтры Мінска надзвычай дарагая, то і ласых на яе хапае. Жыльцам таксама даводзяць, што дом знаходзіцца ў аварыйным стане, таму ім трэба выехаць на ўскраек Мінска. Спадарыня сталага веку, карэнная мінчанка Надзея Міхайлаўна жыве ў гэтым доме больш за паўстагоддзя: «Я не хачу, каб мой дом знеслі. З дому 24-А выселілі людзей, і адразу ж знеслі. Я не за тое, каб атрымаць кватэру. Мне ўсё адно — магу і на ўскрайку жыць. Хачу, каб дом застаўся, я — патрыёт сваёй вуліцы, свайго дома».

«Дом — унікальны. Сцены таўшчынёю больш за метр, столі — амаль чатыры метры. Праводзілася экспертыза дзяржаўным прадпрыемствам ААТ «Будкомплекс», і ў актах было пазначана, што ніякай аварыйнасці дом не мае. Сказалі, што дом перажыве нас і нашых унукаў. Чыноўнікамі адмыслова даводзіцца дом да такога стану. Нам гавораць, што на капітальны і бягучы рамонт няма сродкаў, тэрміны не прыйшлі. Гісторыка-культурная каштоўнасць даводзіцца да такога стану, каб пасля яе разбурыць ці прадаць камерцыйным структурам», — з абурэннем распавядае жыхарка дома Галіна Міхайлаўна.

Жыхары ў адзін голас кажуць, што дом вельмі камфортны — у цёпла-цёпла, добрая вентыляцыя, ды і атмасфера душэўная, хаця будынку больш за сто год. Дарэчы, апошні капітальны рамонт у ім рабіўся ў 1961 годзе. І, нягледзячы на гэта, жыльцы ацэньваюць стан будынка як здавальняючы і нават добры.

Жыхары дома па вуліцы Рэвалюцыйнай, 24 таксама судзяцца з гарадскімі ўладамі. Цяпер справа знаходзіцца на разглядзе ў судзе Маскоўскага раёна сталіцы. Былі прадстаўленыя ўсе дакументы, што дом не аварыйны. Але зрухаў пакуль няма — гарвыканкам не збірае камісій, каб зрабіць ацэнку дома, і трымае справу ў падвешаным стане.

***

«Гістарычны цэнтр — адно з самых прэстыжных, выгодных месцаў, таму без фінансавых інтарэсаў тут не абышлося. Але лічу, што калі нічога не рабіць, то нічога і не будзе. Мы павінны нарасціць нейкую крытычную масу, пасля якой мусіць пачацца пазітыўны працэс. А без элементарных захадаў нічога і не будзе», — падбадзёрвае жыхароў Рэвалюцыйнай старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» Антон Астаповіч.

Эксперты сцвярджаюць, што адсяленне дома і закрыццё яго на так званы капітальны рамонт ці рэканструкцыю прывядзе да знішчэння гэтага помніка архітэктуры, як адбылося з домам на Рэвалюцыйнай, 17, які быў зруйнаваны ва ўгоду бізнес-інтарэсам для ўзвядзення офіснага комплексу. Да слова, нягледзячы, што факт знішчэння помніка кваліфікуецца па ч. 2 арт. 344 Крымінальнага кодэкса, органы пракурорскага нагляду і Мінкульт не прыцягваюць да адказнасці разбуральнікаў спадчыны.

«Рэвалюцыйная 12, 14, 24-А, 17, 32, шматлікія іншыя будынкі гістарычнага цэнтра, вуліца Гандлёвая, Бернардынскі кляштар, плошча Свабоды, 15, і іншыя — усё гэта ці зруйнавана, ці пад пагрозай. Ніякіх станоўчых зменаў, нягледзячы на гучныя дэкларацыі, поўнага адсутнасць жадання структурных зменаў. Гістарычны цэнтр Мінска як помнік горадабудаўніцтва на мяжы поўнага знішчэння», — канстатуюць спецыялісты Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 21 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.55 Навіны.
06.05, 07.10, 08.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
07.05, 08.10 Зона Х.
07.30, 08.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.30 У свеце матораў.
09.05 Nota Bene.
09.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
11.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
12.10 Меладрама «Амерыканская дачка».
14.05 «Культурныя людзі».
14.30 «Вялікай Перамогі Салдаты. Віктар Веташкін».
15.15, 18.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Хранікальна-дакументальны фільм «Я чуў, як зямля стагнала...» (БТ).
16.05 Серыял «Агульная тэрапія». Закл. серыі.
18.25 Відэафільм АТН «Прабач мне».
18.55, 00.45 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.00 Арэна.
19.25 «КЕНО».
19.30 Ток-шоў «Ход у адказ».
20.30 Панарама.
21.10 Адмысловы рэпартаж АТН «Вароты да Перамогі».
21.25 Футбол. Чэмпіянат свету. Іспанія-Гандурас. Прамая трансляцыя.
23.25 Серыял «Часткі цела-5 « (ЗША).
00.15 «Эпоха».
00.50 Дзень спорту.

06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.45, 01.25 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Контуры.
10.10 «Гарады-героі. Масква».
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Мікі Маўс. Хатні клуб».
11.30 «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
12.00 «Малахаў +».
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.40 «Модны прысуд».
14.45 «Кантрольны закуп».
15.30 «Хачу ведаць».
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
22.10 АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
00.00 Навіны спорту.
00.05 «Злачынствы стагоддзя».
00.35 Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
01.40 Навіны спорту.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца.Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
08.30 «Тыдзень».
09.35 «Вялікі сняданак».
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 Тэленавэла.
11.40 «Званая вячэра».
12.35 «Мачаха». Серыял.
13.50 «Зорны рынг».
15.00 «Вялікі горад».
15.40 «Далёкія сваякі».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Дабро пажаліцца».
17.10 «Наша справа».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Мачаха». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, маляня».
20.40 Фільм «Трывожны адпачынак адваката Ларынай». Украіна, 2008г.
22.55 «Сталічны футбол».
23.25 Фільм «P.S. Я кахаю цябе». ЗША, 2007 г.

07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
08.25 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
09.30 У гэты дзень.
09.35 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
10.45 «Пра мастацтва».
11.15 Школа рамонту.
12.15 Серыял «Пакахай мяне зноў».
13.15 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
14.25 Футбол. Чэмпіянат свету. Партугалія-КНДР. Прамая трансляцыя.
16.25 Жаночая ліга.
16.55 Футбол. Чэмпіянат свету. Чылі-Швейцарыя. Прамая трансляцыя.
18.55 Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 1-я серыя.
19.55 Беларуская часіна.
20.55 Калыханка.
21.15 Камедыйны серыял «Універ» (Расія).
21.50 Драма «Супрацiў» (ЗША-Нідэрланды).
23.30 «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.

**РОССИЯ** ТЕЛЕКАНАЛ

07.00 «Раніца Расіі».
09.25 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
10.20 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 «Футбольныя войны». Фільм 1-ы.
12.20 «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
13.10 «Пакой смеху».
13.50 Навіны - Беларусь.
14.25 «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
15.20 Фільм «Жартаваць будзеце?».
16.50 Навіны - Беларусь.
17.15 «Кулагін і партнёры».
17.50 Прэм'ера. «Карменіта. Цыгански запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.25 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
20.20 Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я». Расія, 2009 г.
22.15 Тэлесерыял «Панадворак».
22.50 Тэлесерыял «Каменская».
23.50 «Нічога асабістага».
00.05 Навіны - Беларусь.
00.15 «Весткі».
00.35 Прэм'ера. «Трэцяя вайна» падпалкоўніка Твардоўскага». Дак. фільм.

**НТВ**

07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
07.05 Канал «Сёння раніцай».
08.25 «Праграма Максімум».
09.20 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
10.20 «Сярэдні клас».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.50 Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
13.30 Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
15.05 «Выратавальнікі».
15.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.35 Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Настаўнік у законе. Працяг».
21.40 Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
23.25 Сёння.
23.50 «Сумленны панядзелак».
00.40 «Школа зласлоўя».

**EUROSPORT**

09.30, 12.30, 02.00 Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
10.00 Матаспорт па выхадных.
10.15 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе турынг (Зольдэр, Бельгія).
11.15, 13.00 Тэніс. Турнір АРТ у Вялікабрытаніі (Істборн). Фінал.
14.00 Навіны.
14.05, 16.35, 19.05, 20.05, 21.05, 23.35 Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
14.15 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 1-ы.
15.15 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 2-і.
16.30, 19.00, 20.00, 21.00, 23.30 Навіны.
16.45 Веславанне. Кубак свету ў Германіі.
18.00 Тэніс. Турнір АРТ у Вялікабрытаніі (Істборн). Фінал.
19.15 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 1-ы.
20.15 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 2-і.
21.15 Летні Біятлон. Гран-пры (Германія).
21.50 Вось дык так!!!
22.00 Пра рэстлінг. Агляд WWE.
22.30 Пра рэстлінг. «Vintage Collection». ЗША.
00.10 Навіны.
00.15 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 1-ы.
01.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі (Берген). Дзень 2-і.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

07.00 Тыдзень у «Аб'ектыве».
07.30 Гісторыя пад знакам Пагоні.
07.40, 20.05 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
08.05 Басаножу па свеце.
08.30 Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыя ў эфіры», дак. фільм, 2005 г., Германія.
09.30 Вагон.
09.35 «Арол: крымінальная сага», серыял.
10.30 «Загадкі Мэрдака», серыял.
11.15 «Боская ўмяшанне», маст. фільм, 2002 г., Францыя–Германія.
17.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
17.05 «Папялушка», тэлесерыял.
17.30 «Арол: крымінальная сага», серыял.
18.30 Аўтастопам праз Еўропу: 3 серыя, «Галандыя».
18.50 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
19.10 Гісторыя пад знакам Пагоні.
19.20 «Аблавушак», мультсерыял.
19.35 Еўропа сёння.
20.30 «Васіль Быкаў. Вяртанне», дак. фільм, 2004 г., Беларусь.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.25 Прыватная калекцыя.
21.45 «Happy New York», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
23.15 Аб'ектыў.

## 22 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.10, 08.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
07.05, 08.10 Зона Х.
07.30, 08.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.35 Арэна.
09.05 Серыял «Жыццё, якога не было...».
09.55 Меладраматычны серыял «Агульная тэрапія» (Расія). Заключныя серыі.
11.40 Адмысловы рэпартаж АТН « Вароты да Перамогі».
12.10 Драма «Людзі добрыя» (Расія).
14.05 Ток-шоў «Ход у адказ».
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.25 Серыял «Генеральская ўнучка».
16.25 Сфера інтэрасаў.
16.45, 00.45 Зона Х». Крымінальная хроніка.
16.55 Футбол. Чэмпіянат свету. Мексіка-Уругвай. Прамая трансляцыя.
19.25 «КЕНО».
19.30 Серыял «Жыццё, якога не было...».
20.30 Панарама.
21.25 Футбол. Чэмпіянат свету. Грэцыя-Аргентына. Прамая трансляцыя.
23.25 Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
00.20 «Эпоха».
00.55 Дзень спорту.

06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 00.00, 01.10 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Чакай мяне.
10.00 АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Брэсцкая крэпасць».
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Мікі Маўс. Хатні клуб».
11.30 «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
12.00 «Малахаў +».
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.40 «Модны прысуд».
14.45 «Кантрольны закуп».
15.30 «Хачу ведаць».
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
17.05 «Хай кажуць».
18.15 Навіны спорту.
18.20 Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
18.55 «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
20.00 Час.
21.00 Навіны спорту.
21.05 «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
22.10 АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
00.15 Навіны спорту.
00.20 Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
01.25 Навіны спорту.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца.Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
08.30 Фільм «Трывожны адпачынак адваката Ларынай». Украіна, 2008г.
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
11.40 «Званая вячэра».
12.35 «Мачаха». Серыял.
13.50 «Гучная справа».
14.40 «Свая каманда». Моладзевы серыял.
15.40 «Ваенная таямніца».
16.50 «Сталічны футбол».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Мачаха». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.25 Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
21.30 Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
22.55 СТБ прадстаўляе: «Мяжа, што палае». Дакументальны фільм.
23.25 «Аўтапанарама».
23.45 Фільм «Па мянушцы «Чысцільшчык». ЗША, 2007 г.

07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
08.30 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
09.30 У гэты дзень.
09.35 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
10.50 Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 1-я серыя.
11.40 «Запал па культуры».
12.25 Серыял «Пакахай мяне зноў».
13.20 Пазакласная гадзіна.
13.35 Свая кампанія.
14.15 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
15.20 Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
15.55 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
16.55 Футбол. Чэмпіянат свету. Францыя-ПАР. Прамая трансляцыя.
18.55 Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 2-я серыя.
19.55 Беларуская часіна.
21.00 Калыханка.
21.25 Футбол. Чэмпіянат свету. Нігерыя-Паўднёвая Карэя. Прамая трансляцыя.
23.30 «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
00.10 Спорт-кадр.

**РОССИЯ** ТЕЛЕКАНАЛ

07.00 «Раніца Расіі».
09.20 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
10.10 «Футбольныя войны». Фільм 2-і.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 «Нічога асабістага».
11.40 «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
12.35 Тэлесерыял «Каменская».
13.50 Навіны - Беларусь.
14.30 «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
15.20 Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я».
16.50 Навіны - Беларусь.
17.15 «Кулагін і партнёры».
17.50 Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.25 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
20.20 Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я». Расія, 2009 г.
22.15 Тэлесерыял «Панадворак».
22.50 Тэлесерыял «Каменская».
23.50 Навіны - Беларусь.
00.00 «Весткі».
00.20 Прэм'ера. «Адзін у полі вояр. Подзвіг 41-га». Дакументальны фільм.

**НТВ**

07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
07.05 Канал «Сёння раніцай».
08.25 «І зноў добры дзень!».
09.15 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.20 «Сярэдні клас».
10.50 «Кватэрнае пытанне».
11.55 Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
13.30 Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
15.10 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
15.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.35 Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Настаўнік у законе. Працяг».
21.40 Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
23.25 Сёння.
23.50 «Хто «прашляпіў» пачатак вайны». Дакументальны фільм.
00.45 «Асаблівa небяспечны!».

**EUROSPORT**

09.30, 12.30, 15.00 Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
10.00 Паралімпізм. Кубак свету ў Вялікабрытаніі (Манчэстэр).
11.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 1-ы.
13.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 2-і.
15.30 Веславанне. Кубак свету ў Германіі (Мюнхен).
16.30, 19.00, 20.00, 23.30, 00.10 Навіны.
16.35, 19.05, 20.05, 23.35 Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
16.45 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 1-ы.
17.45 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі. Дзень 2-і.
19.15 Летні біятлон. Гран-пры (Германія).
20.15 Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Фінляндыя).
21.00 Навіны.
21.05 Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
21.15 Бокс. Турнір «Super Six World Classic» у ЗША.
22.00 Бокс. Міжнародны паядынак у ЗША.
00.15 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
00.45 Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Ле-Ман, Францыя). Агляд.
01.15 Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.
02.15 Вось дык так!!!

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

07.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
07.20 Еўропа сёння.
07.50 Прыватная калекцыя.
08.00 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
08.15 Аўтастопам праз Еўропу: 3 серыя, «Галандыя».
08.35 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
09.00 Гісторыя пад знакам Пагоні.
09.10 «Мент», дэтэктыўны серыял.
10.10 «Папялушка», тэлесерыял.
10.30 «Васіль Быкаў. Вяртанне», дак. фільм, 2004 г., Беларусь.
10.55 «Happy New York», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
17.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
17.05 «Папялушка», тэлесерыял.
17.30 «Ветравей», маст. фільм, 1977 г., Аўстралія.
19.00 Госць «Белсату»: гісторык Галіна Васько: «Савецкія партызаны ў Беларусі былі правакатарамі».
19.30 «Аблавушак», мультсерыял.
19.40 Праект «Будучыня».
20.15 «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 1.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.20 «Апошні сезон», серыял.
22.15 Жаўтуха (сатырычная праграма).
22.40 Аб'ектыў.

## 23 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**09.55** Кінааповесць «Паднятая цаліна» (СССР). 1-я серыя.
**11.25** Відэафільм АТН «Быхаў» цыклу «Зямля беларуская».
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Падвойная згуба».
**14.05** «Уласнай персонай».
**14.30** «Вялікай Перамогі Салдаты. Пётр Арлоў».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Генеральская ўнучка».
**16.25** «Зямельнае пытанне».
**16.45, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Славенія-Англія. Прамая трансляцыя.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**20.30** Панарама.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Гана-Германія. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.20** «Эпоха».
**00.55** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.55, 01.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** Асяроддзе пасялення.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.10** Навіны спорту.
**00.15** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**01.20** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Крытычная маса». ЗША, 2000 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 2-я серыя.
**11.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.15** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.10** Спорт-кадр.
**13.35** «Лабірынты: невядомая Літва». Фільм першы.
**14.05** Пазакласная гадзіна.
**14.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**15.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. ЗША-Алжыр. Прамая трансляцыя.
**18.55** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 3-я серыя.
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Аўстралія-Сербія. Прамая трансляцыя.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Футбольныя войны». Фільм 3-і.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.20** Тэлесерыял «Каменская».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.20** Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я». Расія, 2009 г.
**22.15** Тэлесерыял «Панадворак».
**22.50** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі».
**00.20** Прэм'ера. «Натуршчыца для генія». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх норавы».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.55** Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Настаўнік у законе. Працяг».
**21.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Позняя гутарка».
**00.35** «Першая кроў».

### EUROSPORT

**09.30, 12.30, 15.00, 02.00** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Ле-Ман, Францыя). Агляд.
**10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд сезону.
**11.30** Веславанне. Кубак свету ў Германіі (Мюнхен).
**13.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Телфард). Фінал.
**15.30** Летні біятлон. Гран-пры (Цюрых, Швейцарыя).
**16.30** Навіны.
**16.35, 19.05, 23.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.45** Снукер. Мастэрс (Лондан, Вялікабрытанія). Фінал.
**18.45** Вось дык так!!!
**19.00** Навіны.
**19.15** Веславанне. Кубак свету ў Германіі (Мюнхен).
**20.45** Абранае па серадах.
**20.50** Конны спорт. Кубак нацый (Ратэрдам, Нідэрланды).
**21.50** Навіны коннага спорту.
**21.55** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат (Люмбрэ, Францыя).
**22.25** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат Швейцарыі.
**22.35** Гольф-клуб.
**22.40** Абранае па серадах.
**22.50** Яхт-клуб.
**23.05** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**23.30** Навіны.
**00.10** Навіны.
**00.15** Летні біятлон. Гран-пры (Бурштат, Германія).
**01.15** Паралімпізм. Кубак свету ў Вялікабрытаніі (Манчэстэр).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Госць «Белсату».
**08.15** «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 1.
**08.55** Жаўтуха.
**09.15** «Апошні сезон», серыял.
**10.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.30** «Ветравей», маст. фільм, Аўстралія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Апошні сезон», серыял.
**18.25** Моўнік.
**18.35** Прыватная калекцыя.
**19.00** Героі не нашага часу: Зінаіда Ярашэвіч. Загадчыца жыцця.
**19.15** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** На колах.
**20.00** «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 2.
**20.40** Пабач з намі (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Форум: «Вылечыць медыцыну».
**22.05** «Кошт яе раману», трымценнік, 1996 г., ЗША.
**23.30** Аб'ектыў.

## 24 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**09.55** Кінааповесць «Паднятая цаліна» (СССР). 2-я серыя.
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Камедыя «Кітайская бабуля» (Расія).
**13.45** Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Генеральская ўнучка».
**16.25** Сфера інтэрасаў.
**16.45, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Славакія-Італія. Прамая трансляцыя.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**20.30** Панарама.
**21.10** «Актуальнае інтэрв'ю».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Камерун-Нідэрланды. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.20** «Эпоха».
**00.55** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Наталля Селязнёва. З шырока расплюшчанымі вачыма».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсе. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.30** Нашы навіны.
**00.45** Навіны спорту.
**00.50** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**01.35** Нашы навіны.
**01.50** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Круцей не бывае». Германія.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 3-я серыя.
**11.30** Экспедыцыя.
**12.00** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.00** Кінаспробы.
**13.20** Пазакласная гадзіна.
**13.35** Жывы гук.
**14.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**15.20** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**15.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Парагвай-Новая Зеландыя. Прамая трансляцыя.
**18.55** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 4-я серыя.
**19.55** Беларуская часіна.
**20.55** Калыханка.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Данія-Японія. Прамая трансляцыя.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Культасвет.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Футбольныя войны». Фільм 4-ы.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.20** Тэлесерыял «Каменская».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.20** Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я». Расія, 2009 г.
**22.15** Тэлесерыял «Панадворак».
**22.50** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі».
**00.20** «Апошні званок Нестара Пятровіча. М.Конанаў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Бульдог-шоў».
**09.15** «Жаночы погляд».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Вочная стаўка».
**11.40** Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**12.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Настаўнік у законе. Працяг».
**21.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**23.25** Сёння.
**23.50** Прэм'ера. «Алтар Перамогі».
**00.40** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30, 12.30, 15.00, 02.00** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Конны спорт. Кубак нацый (Ратэрдам, Нідэрланды).
**11.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**11.30, 15.30, 19.15** Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд сезону.
**13.00** Снукер. Мастэрс (Лондан, Вялікабрытанія). Фінал.
**16.30** Навіны.
**16.35, 19.05, 20.05, 21.05** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Фінал.
**19.00** Навіны.
**20.00** Навіны.
**20.15** Боўлінг. PBA тур. ЗША. Часопіс.
**21.00** Навіны.
**21.15** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. K 1 (Бухарэст).
**23.30** Навіны.
**23.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.10** Навіны.
**00.15** Вось дык так!!!
**00.25** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.55** Пра рэстлінг. «Vintage Collection». ЗША.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Прыватная калекцыя.
**08.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.20** Пабач з намі (тэлечасопіс).
**08.35** Форум: «Вылечыць медыцыну».
**09.15** «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 2.
**09.55** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.20** «Апошні сезон», серыял.
**11.15** «Бульбаны», мультсерыял.
**11.25** «Ветравей», маст. фільм, Аўстралія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Кошт яе раману», трымценнік, 1996 г., ЗША.
**19.00** YoLife! (моладзевая праграма).
**19.20** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.30** Праект «Будучыня»).
**20.00** «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 3.
**20.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Зграя», сенсацыйны серыял: 3 серыя.
**22.15** «Плошча», дак. фільм, 2006 г., Беларусь.
**23.45** Аб'ектыў.

## 25 ЧЭРВЕНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** серыял «Жыццё, якога не было...».
**09.55** Кінааповесць «Паднятая цаліна» (СССР). 3-я серыя, заключная.
**11.40** «Актуальнае інтэрв'ю».
**12.10, 15.15** Навіны рэгіёна.
**12.25** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**13.15** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**14.20** Відэафільм АТН «Амерыканская мара». Частка 2-я.
**15.25** « Вялікай Перамогі Салдаты. Сяргей Лебедзеў «.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Генеральская ўнучка» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Партугалія-Бразілія. Прамая трансляцыя. У перапынку: Навіны.
**19.00** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Меладраматычны серыял «Жыццё, якога не было...» (Расія).
**20.30** Панарама.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Чылі-Іспанія. Прамая трансляцыя.
**23.25** Вострасюжэтны серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.20** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Наталля Кусцінская. Адплата за каханне».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Летняя серыя гульняў.
**22.40** АНТ прадстаўляе: «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.25** Фільм «Кошт здрады».
**02.10** Нашы навіны.
**02.25-02.35** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінтшчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.20** «Мінтшчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «КВЗ. Першая ліга. 1/4 фіналу».
**22.55** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.35** Фільм «Інферна». ЗША, 1999г.
**01.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Культасвет.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Жансавет.
**10.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.15** Камедыйная драма «Анатомія Грэй-4» (ЗША). 4-я серыя.
**12.05** Гаспадар.
**12.35** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.30** Камедыя «Дзівацтвы буслоў».
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.25** «Свая музыка. Працяг».
**15.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. КНДР-Кот д'Івуар. Прамая трансляцыя.
**19.00** Усё аб бяспецы.
**19.35** Пра мастацтва.
**20.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.55** Калыханка.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Швейцарыя-Гандурас. Прамая трансляцыя.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.

---

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.20** Тэлесерыял «Каменская».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Тэлесерыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Камедыя «Граф Монтэнэгра». Расія.
**22.30** Навіны - Беларусь.
**22.40** Фільм «Старэйшы сын».
**01.10** Фільм «Жэня, Жэнечка і «Кацюша».

---

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Лепшы горад Зямлі».
**09.20** «Асабліва небяспечны!».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «І зноў добры дзень!».
**11.40** Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**12.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.10, 20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**21.00** Прэм'ера. «Прыгажосць. Гісторыя ўсерасійскага змагу».
**22.55** Фантастычны трылер «Газонакасільшчык».
**01.05** Гісторыка-прыгодніцкі фільм «Агністая зямля».

---

**09.30, 12.30, 15.00, 02.00** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі (Берген). Дзень 1-ы.
**11.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі (Берген). Дзень 2-і.
**13.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая (Пекін). Фінал.
**15.30** Наймоцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Германія).
**16.30** Навіны.
**16.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.45** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). Фінал.
**18.45** Пляжны футбол. Еўраліга ў Францыі (Марсэль). Адборачны этап. Партугалія - Іспанія. Прамая трансляцыя.
**19.50** Навіны.
**19.55** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**20.00** Пляжны футбол. Еўраліга ў Францыі (Марсэль). Адборачны этап. Польшча - Францыя. Прамая трансляцыя.
**21.00** Навіны.
**21.05** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.15** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Фінляндыя).
**22.15** Боўлінг - PBA тур. ЗША. Часопіс.
**23.20** Вось дык так!!!
**23.30** Навіны.
**23.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.10** Навіны.
**00.15** Ралі. Ралійная серыя IRC у Бельгіі (Іпр). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**00.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**01.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Ле-Ман, Францыя). Агляд.
**01.45** Вось дык так!!!

---

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** «Плошча», дак. фільм, 2006 г..
**09.15** «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 3.
**10.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.30** YoLife! (моладзевая праграма).
**10.45** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**11.40** «Палкоўнік Квяткоўскі», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.15** Форум: «Вылечыць медыцыну».
**19.00** Басанож па свеце.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** На колах.
**20.00** МакраФон: «Рок-карона–2008», ч. 1.
**20.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Спадар Забойства», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**22.45** Аб'ектыў.

## 26 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

---

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Планета дрэў» (Францыя).
**07.15** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**10.35** Шпілька.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.15** Рамантычная драма «Сорак першы» (СССР).
**14.00** Хранікальна-дакументальны фільм «Гвардыя. Баявыя традыцыі» (Беларусь). 1-я і 2-я серыі.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**16.55** Відэафільм АТН «Быхаў» цыклу «Зямля беларуская».
**17.10** «OFF STAGE LIFE».
**17.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Канцэрт Лаймы Вайкуле.
**20.30** Панарама.
**21.05** «OFF STAGE LIFE».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету.1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.25** Драматычны баявік «Палонны» (Расія-Балгарыя).
**00.50** Уласнай персонай.

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Анімацыйны фільм «Ліло і Сціч».
**12.40** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Звяз».
**13.10** «Кінаметры вайны».
**13.40** «Трэцяга не дадзена». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Святлана Кручкова. Я навучылася проста, мудра жыць...».
**17.20** Фільм «Жыццё ў ружовым колеры».
**19.55** «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Розыгрыш».
**22.20** «Музычныя вечары ў Мірскім замку».
**00.20** Прафесійны бокс.

---

**07.00** «Анфас».
**07.15** «Афрамаскві - 2». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Фантазёры». СССР, 1965г.
**09.10** «Дабро пажаліцца».
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.10** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.40** Фільм «Крах інжынера Гарына». СССР, 1973г. 1-2 серыі.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Здзіві мяне». Украіна, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.25** Фільм «Братэрства ваўка». Францыя, 2000 г.
**23.55** Фільм «Вельмі рускі дэтэктыў». Расія, 2008 г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**06.55** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.20** Усё аб бяспецы.
**07.45** Нашы тэсты.
**08.25** Жансавет.
**09.05** Свая кампанія.
**09.50** «Лабірынты: невядомая Літва». Фільм другі.
**10.20** «Запал па культуры».
**11.05** Дэтэктыў «Візіт да Мінатаўра» (СССР). 1-я-3-я серыі.
**14.55** Прыгодніцкі баявік «Нуль-сёмы змяняе курс» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**19.05** «Смешныя людзі». Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.40** Музычная драма «Аўгуст Раш» (ЗША).
**22.45** Жывы гук.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Рамантычная камедыя «Змешванне жанраў» (Францыя).

---

**07.00** Фільм «Жэня, Жэнечка і «Кацюша».
**08.25** Камедыя «Граф Монтэнэгра».
**10.15** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.15** Фільм «Старэйшы сын».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Уся Расія».
**14.30** «Пакой смеху».
**15.25** Фільм «Чужыя лісты».
**17.15** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.45** Фільм «Вялікае каханне». Расія.
**21.45** Тэлесерыял «Дашнікі». Расія, 2008 г.
**23.50** Фільм «Уваранне». Расія, 2008 г.
**01.30** Фільм «Самотны гулец».

---

**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Іх норавы».
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Крымінальная меладрама «Гераіня свайго рамана».
**16.00** Сёння.
**16.15** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**17.50** «Вочная стаўка».
**18.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.05** Рамантычная камедыя «Двойчы ўчора».
**00.55** Драматычны баявік «Бязлітасны».

---

**09.30** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд сезону.
**11.30** Пляжны футбол. Еўраліга ў Францыі (Марсэль). Адборачны этап. Польшча - Францыя.
**12.30** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**13.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). Фінал.
**14.30** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**15.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Швейцарыі (Ньон). Жанчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**16.30** Навіны.
**16.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.45** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі (Берген). Дзень 2-і.
**17.30** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір у Германіі (Ватэншайд). Прамая трансляцыя.
**19.30** Навіны.
**19.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.45** Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**21.00** Навіны.
**21.05** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.15** Конны спорт. Турнір «Global Champions» (Манака). Прамая трансляцыя.
**23.00** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір у Германіі (Ватэншайд).
**23.30** Навіны.
**23.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.10** Навіны.
**00.15** Ралі. Ралійная серыя IRC у Бельгіі (Іпр). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**00.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. К 1 (Бухарэст).
**02.30** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.

---

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Форум (ток-шоў): «Вылечыць медыцыну».
**08.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.55** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**09.20** «Папялушка», тэлесерыял.
**09.45** Аблавушак», мультсерыял.
**10.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**11.05** МакраФон: «Рок-карона–2008», ч. 1.
**11.35** «Спадар Забойства», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.35** «Сакрэтная гісторыя архіпелагу ГУЛАГ», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** «Рок назаўжды», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 2.
**20.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Паляванне на дзівосы (спазнаваўчая праграма).
**21.30** Суботні сеанс: «Папіён», біяграфічная драма, 1973 г., ЗША.
**23.50** Аб'ектыў.

## 27 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.55** Мультфільм «Прыгоды Бураціна».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў (Беларусь).
**09.50** «Альманах вандраванняў».
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.55** «У свеце матораў».
**11.25** «Nota Bene».
**12.10** Музычная камедыя «Дзяўчына з гітарай» (СССР).
**13.50** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Хранікальна-дак. фільм «Гвардыя. Баявыя традыцыі» (Беларусь). 3-я і 4-я серыі.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Чырвоны аксаміт Кыргызтана».
**16.10** Прэм'ера. Музычная меладрама «Па: Сучасная гарадская казка» (Расія).
**18.00** Суперлато.
**18.55** Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.50** «КЕНО».
**20.00** «У цэнтры ўвагі».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.25** Трылер «Адрачэнец» (ЗША).

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**10.25** Пакуль усе дома.
**11.20** «Шчасце ёсць!».
**12.10** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.45** «Фазэнда».
**13.25** «Разумніцы і разумнікі».
**14.30** «Песні Перамогі».
**15.05** Севастопальскія аповяды.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Вышэйшы пілатаж».
**18.10** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Канцэрт Элтана Джона «Лепшыя хіты ўсіх гадоў».
**22.25** Фільм «Палата № 6».
**00.05** Фільм «Закахацца ў нявесту брата».

**07.05** «Афрамасквіч - 2». Камедыйны серыял.
**07.55** Фільм «Зачараваная Эла». ЗША - Вялікабрытанія - Ірландыя, 2004г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** «Дарагая перадача».
**14.00** Фільм «Крах інжынера Гарына». СССР, 1973 г. Заключныя серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** СТБ прадстаўляе: «Мяжа, што палае». Дакументальны фільм.
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Мая назаўжды». ЗША - Канада - Вялікабрытанія, 1999 г.
**22.50** «Прафесійны бокс».
**23.45** Фільм «Я заўсёды жадаў быць гангстэрам». Францыя, 2007 г.
**01.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.20** Дабравест.
**07.45** Мір вашай хаце.
**07.55** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.20** Нашы тэсты.
**08.55** Дак.-пазнавальны фільм «Віртуальная энцыклапедыя: Вавілон» (Францыя).
**10.00** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** «Універсальны салдат». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**12.30** «Правы чалавека».
**12.45** Дэтэктыў «Візіт да Мінатаўра» (СССР). 4-я і 5-я, заключная, серыі.
**15.20** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.15** Экспедыцыя.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**18.55** Смешная часіна.
**19.30** Дэтэктыўны серыял «Я целаахоўнік. Памылка ў праграме» (Расія). 1-я серыя.
**20.35** Тэлебарометр.
**20.55** Серыял «Я целаахоўнік. Памылка ў праграме» (Расія). 2-я-4-я, закл. серыі.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Свая музыка. Працяг.

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.35** Фільм «Уварванне». Расія, 2008 г.
**09.15** Тэлесерыял «Даішнікі». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.15** Фільм «Служкі д'ябла на чортавым млыне».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** Фільм «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку».
**17.05** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** «Сумленны дэтэктыў».
**20.35** Фільм «Жаночае сяброўства». 2007 г.
**22.30** Вострасюжэтны фільм «Зваротны адлік». Расія, 2007 г.
**00.40** Фільм «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку».

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Выратавальнікі».
**10.55** «Крамлёўскія жонкі».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** Прэм'ера. «Лепшы горад зямлі».
**14.15** Фільм «Тонкая штучка».
**16.00** Сёння.
**16.25** «І зноў добры дзень!».
**17.25** «Масквічы».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Бульдог-шоў».
**21.45** Крымінальная камедыя «Адаптацыя».
**23.50** «Авіятары».
**00.25** «Асабліва небяспечны!».

**09.30** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір у Германіі (Ватэншайд).
**11.00** Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 1-ы.
**12.15** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.
**12.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Навіны. Прамая трансляцыя.
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Сан-Марына (Мізана). Заезд 1. Прамая трансляцыя.
**14.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў Сан-Марына (Мізана). Прамая трансляцыя.
**15.15** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір у Германіі (Ватэншайд).
**16.15** Навіны.
**16.20** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Сан-Марына (Мізана). Заезд 2. Прамая трансляцыя.
**17.30** Плаванне. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**19.30** Навіны.
**19.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.45** Мотаспорт па выходных.
**20.00** Пляжны футбол. Еўраліга ў Францыі (Марсэль). Адборачны этап. Францыя - Партугалія. Прамая трансляцыя.
**21.00** Навіны.
**21.05** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.15** Бокс. Міжнародны паядынак у ЗША (Маямі).
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак у Германіі.
**23.30** Навіны.
**23.35** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.10** Навіны.
**00.15** Ралі. Ралійная серыя IRC у Бельгіі (Іпр). Агляд.
**00.45** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Сан-Марына (Мізана). Заезд 2.
**01.45** Мотаспорт па выходных.
**02.00** Футбол. Soccer city. Йоханэсбург, ПАР.

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** Паляванне на дзівосы.
**08.10** «Рок назаўжды», дак. фільм, ч. 2.
**08.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.50** «Сакрэтная гісторыя архіпелагу ГУЛАГ», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**09.45** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.10** «Аблавушак», мультсерыял.
**10.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**11.20** «Папіён», драма, 1973 г., ЗША.
**17.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.25** Дакументальная гадзіна: «Два-тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял.
**19.25** Вагон.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Побач з намі.
**21.45** Фільматэка майстроў: «Ляціце на Расінанце», маст. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**23.10** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: з 1 мая змяніліся нашы рэквізіты ў банку. Нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Кассир

Пеня ________

Всего ________

Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЧЭМПІЯНАТ

# ФУТБОЛ: ПЕРАМОГА АБО СМЕРЦЬ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Інтрыга цяперашняга Кубка свету не толькі ў тым, хто стане чэмпіёнам. У турніры бяруць удзел каманды, сустрэчы паміж якімі за доўгія гады набылі характар сапраўднай вендэты. Вось спіс пар зборных, якія найбольш варожа ставяцца адна да адной, і кароткі экскурс у гісторыю іхняга супрацьстаяння.**




## Англія — Аргенціна

Усё пачалося ў 1/4 фіналу Кубка свету ў 1966 годзе. Аргенцінцы паспрабавалі аспрэчыць забіты англійскім форвардам гол. Спрэчка закончылася чырвонай карткай для капітана аргенцінцаў. Эмоцыі перайшлі ўсе межы. Трэнер англічан нават забараніў сваім гульцам пасля матчу мяняцца з аргенцінцамі майкамі, і ўвогуле ў адным з каментараў назваў футбалістаў з Паўднёвай Амерыкі «жывёламі». Аргенціну адразу ахапілі антыбрытанскія настроі.

Кульмінацыяй супрацьстаяння Англіі і Аргенціны, натуральна, лічаць сустрэчу ў 1986 годзе на чэмпіянаце свету ў Мексіцы. За чатыры гады да яго Аргенціна прайграла Брытаніі вайну за Фальклены. «Гэта была краіна, якая прайграла вайну, а не футбольная каманда. Гэта была помста», — так пісаў у сваіх мемуарах пра стан зборнай Аргенціны напярэдадні матчу яе лідэр Дыега Марадона. Як вядома, Аргенціна тады перамагла 2:1. І перамогу прынёс гол Марадоны, які ён забіў рукою (ён назваў гэты інцыдэнт «Рука бога»).

Пра той інцыдэнт памятаюць да гэтага часу. Увогуле, на кубках свету каманды сустракаліся 5 разоў (1962, 1966, 1986, 1998, 2002 гады). Тры разы перамагала каманда з Альбіёну.

## Англія — Германія

«У футбол гуляюць усе, аднак перамагаюць немцы». Узгадваючы гэту вядомую прымаўку, цяжка зразумець вынікі першых сустрэч зборных Англіі і Германіі. У далёкім 1898 годзе немцы прайгралі англічанам з лікам 2:13.

Знакавым матчам стаў вельмі эмацыйны і драматычны фінал 1966 года.

Тады брытанец Хёрст забіў немцам вельмі спрэчны гол. Суддзя залічыў узяцце варот пасля кансультацый з бакавым суддзёй — Тофікам Бахрамавым (СССР). ФРГ гучна пратэставала. Немцы лічылі, што паводзіны Тофіка — помста Савятаў за паразу ад ФРГ у паўфінале. «Дзве сусветныя вайны і адзін Кубак свету», — так характарызавала тагачасныя адносіны паміж нацыямі адна з нямецкіх газет.

Аднак хутка немцы ўзялі сваё. Дзякуючы такім карыфеям, як Франц Бекенбауэр і Герд Мюлер, у 1970-м годзе ў Мексіцы, саступаючы 0:2, яны перамаглі з лікам 3:2. Гэта была нацыянальная катастрофа для англічан. У знак пратэсту на выбарах, якія адбыліся праз пару дзён, брытанцы адправілі ўрад лейбарыстаў у адстаўку.

Важнай сустрэчай быў матч 3 ліпеня 1990 года ў Італіі. Гэта быў час аб'яднання Германіі, супраць якога, дарэчы, выступаў афіцыйны Лондан. Спыніць нямецкую машыну не ўдалося ні на полі дыпламатыі, ні на спартовай пляцоўцы. Па пенальці Англія прайграла 3:4.

Сетка цяперашняга турніру складзена так, што Англія і Германія могуць сустрэцца ўжо ў наступнай стадыі турніру. Гэта будзе іх першая сустрэча на чэмпіянатах свету з таго памятнага матча ў ліпні 1990 года, што абяцае фантастычнае відовішча.

## Аргенціна — Бразілія

Пралогам канфлікту стаў матч 1937 года ў Буэнас-Айрэсе на Кубку Амерыкі. Перамаглі аргенцінцы, аднак да таго, як прагучаў свісток, бразільцы пакінулі поле. Ім не спадабаліся аргенцінскія фанаты, якія называлі бразільцаў «макакамі». «Матч ганьбы» — назвалі ў Бразіліі тую сустрэчу.

Тэндэнцыю працягнула гульня ў 1939 годзе ў Рыа. Пасля таго, як рэферы прызначыў пенальці ў вароты аргенцінцаў, іх варатар атакаваў суддзю. На поле з'явілася паліцыя. У знак пратэсту аргенцінцы пакінулі поле, а бразільскі футбаліст забіў пенальці ў пустыя вароты.

У фінале Куба Амерыкі 1946 года біліся ўсе: спартсмены, паліцыя і гледачы. Некалькі футбалістаў пасля той разборкі з-за траўм пакінулі спорт.

У аналы гісторыі ўвайшлі падзеі 1978 года ў Аргенціне, дзе праходзіў Чэмпіянат свету. Бразілія ў групавым раўндзе выйграла ў Аргенціны і, здавалася, гарантавала сабе месца ў фінале. Аргенціне, каб абыйсці бразільцаў, трэба было забіваць камандзе Перу як мінімум пяць безадказных мячоў. Яны забілі шэсць. Да гэтага часу ходзяць чуткі, што гаспадары турніру далі перуанцам вялікі хабар. Уся Бразілія была абураная. Каб неяк кампенсаваць фіяска, зборнай нададі тытул «маральныя чэмпіёны свету».

З тых часоў супрацьстаянне працягваецца з пераменным поспехам. Тут ёсць дадатковы




аспект, бо вынікі сустрэч пэўным чынам уплываюць на ход палемікі — хто самы вялікі футбаліст у гісторыі: бразілец Пеле або аргенцінец Марадона?

## Мексіка — ЗША

Гэта адна з самых маладых вендэт у футболе, хаця каманды сустракаюцца з 1934 года. Галоўная прычына — традыцыйныя антыамерыканскія настроі ў Мексіцы. Футбол — адзін з тых відаў спорту, дзе ЗША слабейшыя, і мексіканцы могуць адчуць перавагу над больш заможнымі грынга. Як прыклад, 46 гадоў запар пасля першай сустрэчы мексіканцы не прайгравалі амерыканцам. Аднак апошні час тут нешта зламалася. У 2002 годзе каманды сустрэліся ў Паўднёвай Карэі, і нечакана для ўсіх амерыканцы перамаглі 2:0. Цяпер усе мексіканцы чакаюць сатысфакцыі.



## Германія — Нідэрланды

Усяму віной германская акупацыя Нідэрландаў у час другой сусветнай вайны і катастрофа 1974 года. У 1970-я гады галандскі футбол зрабіў сапраўды прарыў. Усе чакалі, што ў 1974-м каманда пераможа на Чэмпіянаце свету ў Германіі. Аднак перамаглі немцы. У Нідэрландах панавала неафіцыйная нацыянальная жалоба. Галандцы рэабілітаваліся, калі ўзялі ў 1988 годзе ў Германіі тытул чэмпіёнаў Еўропы. «У 1940-м прыйшлі яны, у 1988-м прыйшлі мы», — любімая песня галандскіх фанатаў. Менавіта вострыя адносіны балельшчыкаў робяць атмасферу матчаў Галандыі і Германіі вельмі напружанай. Абодва бакі прыдумляюць рознага кшталту абразлівыя песні на адрас апанентаў. Настроі на трыбунах перадаюцца на поле. Падчас адной такой сустрэчы галандскі футбаліст нават спрабаваў задушыць нямецкага калегу.

## Францыя — Італія

Гэту вендэту парадзіла спрэчка паміж французам Зінедзінам Зіданам і італьянцам Марка Мацерацці падчас фіналу папярэдняга кубка свету. Італія ў выніку перамагла, аднак італьянцы не могуць прабачыць Зідану тое, што ён ударыў галавой іхняга суайчынніка. У сваю чаргу, для французаў расправа над Мацерацці — своеасаблівая кампенсацыя за паразу.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Аднак, па вялікаму рахунку, усе гэтыя кандыдаты не збіраюцца гуляць у гульню пад назвай «галасаванне». У Беларусі сапраўды не важна, як галасуюць выбаршчыкі, важней, як палічаць іх галасы. Таму ўсе чакаюць не разумнага ці арыстакратычнага кандыдата — суперніка Лукашэнкі. Патрэбен чалавек, які ў крытычны момант здолее павесці за сабой людзей на вуліцу, каб даказаць, што час Аляксандра Лукашэнкі прайшоў.

**«Взгляд» (Расія)**

Па яго (Аляксандра Сурыкава) словах, у рамках Саюзнай дзяржавы дзейнічаюць мытныя дамоўленасці, аднак калі Беларусь не падпіша дакументы па Мытным саюзе, то прыярытэтам Расіі стануць двухбаковыя дамовы, падпісаныя з Казахстанам. «Масква ў Мытным саюзе не можа ўшчамляць інтарэсы Астаны, і гэта сітуацыя пагражае мытнаму складніку Саюза Беларусі і Расіі», — падкрэсліў пасол. Тэзіс, выказаны Сурыкавым, мае прынцыповую навізну. Ён фактычна спісвае з рахункаў Саюзную дзяржаву, бо няма ніякай прававо базы, якая значыла б, што Саюзная дзяржава ў пэўных момантах мае прыярытэт у параўнанні з нейкімі іншымі дамоўленасцямі.

**«Независимая газета» (Расія)**

Лукашэнка не зможа доўга трымаць Бакіева ў сябе. Не так даўно прэзідэнт Беларусі заявіў, што Бакіеў хоча паехаць у Кыргызстан, абвясціць рэферэндум і скласці з сябе паўнамоцтвы. Гэта ўжо першыя сігналы пра тое, што Лукашэнка не будзе яго трымаць доўга, і, хутчэй за ўсё, Бакіеў будзе арыштаваны.

**«Vesti» (Азербайджан)**

Вельмі дарэчы прыйшлася б цесная, аж да стварэння рэгіянальнага інтэграцыйнага саюза, кааперацыя Украіны і Беларусі. Гэта дапамагло б як узмацніць статус нашых краін, так і даць дадатковыя козыры на перамовах з мацнейшай Расіяй. Залежнасць ад энерганосьбітаў нас з Беларуссю аднаначна аб'ядноўвае. Шкада толькі, час сыходзіць. Беларусь афіцыйна абвясціла, што з 1 ліпеня далучаецца да Мытнага саюза з Расіяй і Казахстанам.

**«Рабочая газета» (Украіна)**

Беларусь — добры рэгіянальны праект. Варта адзначыць, што ў беларусаў у кароткія тэрміны «паставілі» нацыянальную самасвядомасць, а беларуская нацыя ў цэлым зараз павярнулася да Еўропы. Як і сам Бацька, дарэчы: заўважце, яго завуць апошнім дыктатарам Еўропы. Так, дыктатарам, але без азіятчыны. Як Франка, да прыкладу, ці Мусаліні.

**«Свободная пресса» (Расія)**

Трэба сказаць, што праблемы на беларускага лідэра ў апошні час зваліліся з усіх бакоў. Да санкцый ЗША дадалася яшчэ і крымінальная справа. У Аўстрыі пачалі расследаваць справу, звязаную з адпачынкам кіраўніка Беларусі ў Альпах у 2002 годзе. Аўстрыйскі НАК тады аплаціў выдаткі на знаходжанне Бацькі з сям'ёй на горналыжным курорце ў памеры 200 тысяч еўра, а паездка адбылася, нягледзячы на забарону ўезду Лукашэнкі ў Еўропу. Кажуць, што Лукашэнка заплаціў аўстрыйцам за гэты «вяжу Еўропу» некалькімі беларускімі заводамі. Самому Бацьку, зразумела, нічога не пагражае. А вось яго спонсарам можа быць кепска.

**«Московский комсомолец» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ХАРВАТЫЯ — СЛАВЕНІЯ: КАНЕЦ ПАМЕЖНАМУ КАНФЛІКТУ

Любляна і Заграб у хуткім часе могуць вырашыць стары памежны канфлікт, які з'яўляецца адной з перашкод на шляху інтэграцыі Харватыі ў склад ЕС, Канфлікт цягнецца ўжо 19 гадоў і тычыцца прыналежнасці чатырох вёсак. Для маленькай Славеніі доўгі час лёс гэтых вёсак быў прынцыповым пытаннем. Любляна неаднаразова казала пра тое, што з-за гэтага не дасць дабро на ўступленне Харватыі ў ЕС. Але нарэшце славенскія палітыкі прызналі, што сяброўства Харватыі ў ЕС дае суседняй краіне значна больш бонусаў. На рэферэндуме большасць славенцаў пагадзіліся з ідэяй запрасіць пасярэднікаў з Бруселю, якія павінны вырашыць спрэчку.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. ГАЛОЎНЫ ЛЕЙБАРЫСТ

Пяць сяброў лейбарысцкай партыі прайшлі фармальнасці, якія дазваляюць ім выстаўляць свае кандыдатуры на пасаду лідэра другой у краіне партыі, якая цяпер знаходзіцца ў апазіцыі. Каб балатавацца на гэту пасаду, патрэбна сабраць 33 подпісы сяброў фракцыі ў парламенце. Такім чынам, змагацца за званне галоўнага апазіцыянера Яе Вялікасці будуць Эндзі Бэрнэм, чарнаскурая Дыяна Абат, Дэвід і Эд Мілібанд і, нарэшце, правая рука былога прэм'ера Гордана Брауна Эд Болс. Фаварытам застаецца Дэвід Мілібанд — былы міністр замежных спраў. Цікавая сітуацыя склалася вакол Дыяны. Каб падкрэсліць сваё талерантнае стаўленне да чарнаскурай грамады, шмат хто з сяброў фракцыі і кіраўніцтва партыі даў ёй подпісы. Нехта нават заклікаў галасаваць за яе. Аднак, хутчэй за ўсё, гэта толькі гульня на публіку.



**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ФРАНЦЫЯ. ДАЛУЧЫЦЬ ФРАНКАМОЎНУЮ БЕЛЬГІЮ

Своеасаблівым адказам на рост сепаратысцкіх лозунгаў з боку прадстаўнікоў фламандскай часткі Бельгіі сталі заклікі прыяднаць да Францыі франкамоўную Валонію. Як піша французская прэса, большасць грамадзян краіны выступаюць за такі сцэнар у выпадку развалу Бельгіі. Адпаведна апытанню, якое арганізавала выданне «France Soir», прыкладна 65 працэнтаў французаў за далучэнне Валоніі. Прычым раней гэтая лічба складала толькі 54 працэнты. Зараз будучыня адзінай Бельгіі вельмі не вызначаная з-за супярэчнасцяў паміж фламандскім і франкамоўным рэгіёнамі. У падобнай сітуацыі раскол краіны цалкам рэальны. Хаця ідэю прыяднання Валоніі да Францыі можа аспрэчыць Берлін. У Бельгіі жыве прыкладна 70 тысяч этнічных немцаў. Да першай сусветнай вайны тэрыторыя, на якой яны пражываюць, належала Германіі.

**Па матэрыялах «Junge Freiheit» (Германія)**

### ЗША. САМЫ ЗАГАДКАВЫ ВЫПАДАК

Сапраўды загадкавая электаральная гісторыя адбылася ў Паўднёвай Караліне. На дэмакратычных праймерыз за права ўдзелу ў выбарах у Сенат нечакана перамог 32-гадовы Эл Грын. Дзіўна тут тое, што Грын — беспрацоўны (былы вайсковец), які наогул не выдаткаваў грошай на кампанію (у яго нават няма перадвыбарнага сайту, а жыве ён з бацькамі). Як Грын мог перамагчы, ніхто не можа даць зразумелага адказу. Эл абсалютна нікому не вядомы і нават не быў ні на адным выбарным мерапрыемстве. Грын набраў 59 працэнтаў на выбарах, а яго адзіны апанент кангрэсмен Вік Рол — толькі 41 працэнт. Пры гэтым Рол выдаткаваў на кампанію 186 000 долараў і браў удзел у шматлікіх перадвыбарчых мерапрыемствах. Але, тым не менш, прайграў. Адзінае тлумачэнне: выбаршчыкі не ведалі нікога з кандыдатаў, і Грын перамог таму, што быў вышэй у спісе кандыдатаў, які складзены ў алфавітным парадку.

**Па матэрыялах амерыканскай прэсы**

### ІСПАНІЯ. ІЗРАІЛЬСКІХ ГЕЯЎ НЕ ЗАПРАСІЛІ

Арганізатары самага буйнога ў Еўропе гей-парада, які адбудзецца ў Мадрыдзе, пастанавілі не запрашаць на мерапрыемства ізраільскую дэлегацыю. Парад адбудзецца 3 ліпеня. Прычына — Ізраіль парушае правы чалавека, а дакладней, атакаваў флатылію свабоды, якая ішла ў сектар Газа. Акрамя таго, арганізатары не гарантуюць ізраільскім гомасексуалістам бяспеку на вуліцах іспанскай сталіцы. Ізраільскія калегі выказалі незадавальненне рашэннем іспанцаў. Па іх словах, ізраільскія арганізацыі геяў не займаюцца палітыкай, і больш таго, яны самі — ахвяры дзяржавы, якая доўгі час не прызнавала правы сексуальных меншасцяў. Фестываль геяў у Ізраілі ў гэтым годзе, дарэчы, не праводзіцца з-за пагрозаў з боку артадаксальных габрэйскіх рэлігійных сектаў. У мінулым годзе падчас яго правядзення два чалавека былі забітыя гомафобамі. Гэта акалічнасць падштурхнула шматлікія іспанскія арганізацыя сексуальных меншасцяў праявіць салідарнасць з калегамі з Блізкага Усходу. Некаторыя іспанцы нават вырашылі байкатаваць мадрыдскі гей-парад.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

ЦІКАВА



Кадр з фільма «Па-за законам»

# ФРАНЦУЗСКАЯ КАТЫНЬ

Іван БІЧ

**Францыя і Алжыр пасварыліся з-за фільму, які прапануе глядзець на 8 мая 1945 года вачыма алжырцаў.**

Май 1945 года. Германія восьвось падзе пад ударам саюзнікаў антыгітлераўскай кааліцыі. Атмасфера доўгачаканай перамогі і спадзяванне на будучыя пазітыўныя змены пануе не толькі сярод еўрапейцаў, аднак і жыхароў французскай калоніі Алжыр. Тубыльцы, якія падчас вайны змагаліся за вольную Францыю, мараць, што метраполія ў адказ на лаяльнасць пашырыць іхнія правы.

Як толькі 8 мая з Берліну прыходзіць навіна пра капітуляцыю нацыстаў, тысячы людзей выходзяць на вуліцы. У горадзе Сеціф у натоўпе дэманстрантаў малады патрыёт нясе забаронены ў калоніі нацыянальны алжырскі сцяг. Падчас спробы забраць сцяг паліцэйскі забівае юнака. Гэта становіцца знакам для пачатку беспарадкаў і пагромаў кварталаў белых каланістаў. Хваляванні ахопліваюць цэлы рэгіён. Падаўляць бунт даводзіцца арміі, прычым далёка не гуманнымі сродкамі. Вынік — сто забітых каланістаў і каля 20 тысяч арабаў.

Алжырскае 8 мая ў Францыі доўгі час было такім жа табу, як тэма Катыні ў Расіі. У 1945 годзе амаль ніхто з еўрапейцаў не пратэставаў супраць учынкаў французскай арміі ў Алжыры. Прызначаная генералам дэ Голем камісія знайшла дзеянні паліцыі і войска цалкам адпаведнымі сітуацыі. Варта дадаць, што для шматлікіх алжырскіх нацыяналістаў падзеі ў Сеціфе сталі галоўным фактарам, каб адмовіцца ад рэфармісцкіх ілюзій і пайсці ў партызанку.

Францыя пачала прызнаваць адказнасць за падзеі толькі ў 2005 годзе. Пасол Францыі зрабіў спецыяльную заяву на гэты конт. Рашыд Бушарэб — французскі рэжысёр алжырскага паходжання — вырашыў таксама закрануць забароненую тэму. Галоўным героям яго карціны «Па-за законам» даводзіцца ў маладосці прайсці праз трагедыю ў Сеціфе.

Фільм упершыню планавалася паказаць падчас апошняга фестывалю ў Канах у рамках французскага блоку. Фестываль, як вядома, адбыўся ў маі. Аднак задоўга да таго, як сусветныя зоркі прайшліся па чырвонай дарожцы, у Францыі пачаўся скандал.

10 красавіка Ліанэль Лука — дэпутат ад партыі Сарказі «Саюз за народны рух» (UMP) — у гарадскім савеце Ніцы запатрабаваў забароны дэманстрацыі карціны ў Канах. Сам фільм дэпутат не глядзеў. Аднак, прачытаўшы сінопсіс, палічыў карціну замахам на праўду аб вайне. Па ягоных словах, трактоўка падзей у Сеціфе не адпавядае гістарычным фактам. Перад тым, як выпусціць стужку на экран, Бушарэб павінен атрымаць дазвол спецыяльнай камісіі гісторыкаў.

Дэпутат пры гэтым спасылаўся на скандальнае інтэрв'ю рэжысёра адной алжырскай газеце, дзе ён казаў пра тое, што сваім фільмам «хацеў бы паказаць праўду, якую доўга хавалі ў шафе». «Як можа нехта казаць, што толькі ён ведае праўду?!» — абурыўся Лука.

Ініцыятыву Лукі імкліва падтрымалі шэраг дэпутат французскага парламенту ад партыі галістаў. У хуткім часе Міністэрства культуры Францыі вырашыла прыбраць фільм са спісу стужак, якія павінны былі ісці ў рамках Канскага фестывалю. Таксама фільм вырашылі не пускаць у пракат.

Гэта выклікала адмоўную рэакцыю з боку левай апазіцыі. На думку палітыкаў гэтага лагера, гісторыя вакол фільму — палітычная правакацыя ўладнай партыі, якой хацелася б пагуляць на расавых забабонах. «Як можна казаць пра тое, што фільм не адпавядае гістарычнай праўдзе пра Сеціф, — піша прэса, — калі сцэна пагромаў у Сеціфе, займае ў фільме ўсяго 6 хвілін?» Некаторыя левыя нават патрабавалі, каб дзяржава ўвогуле адмовілася ад манаполіі на гістарычную праўду.

Алею ў полымя падліў афіцыйны Алжыр, які нядаўна пасварыўся з Парыжам па шэрагу пытанняў. Іх міністэрства культуры ўключыла твор Бушарэба ў алжырскі спіс фільмаў для паказу ў Канах. Такі крок выклікаў крытыку з боку ўнутранай апазіцыі. Дысідэнты таксама патрабуюць ад Францыі прызнаць адказнасць за масавыя забойствы ў маі 1945-га. Аднак пры гэтым не хочуць, каб тэмай скарысталіся ўлады. Апошнія гэтак жа мала цырымоняцца з грамадзянскімі пратэстамі алжырцаў, як і ў свой час французская каланіяльная адміністрацыя. Дасткова згадаць рэпрэсіі супраць паўстання бербераў у 2004 годзе.

Так ці інакш, у выніку 21 мая ў Канах адбыўся прэм'ерны паказ «Па-за законам». Крытыкі дружна палічылі, што на ўзнагароду фільм не цягне. Цікава, што некаторыя гісторыкі, праглядзеўшы карціну, пагаджаюцца з французскім дэпутатам у тым, што твор сапраўды супярэчыць некаторым фактам. Масавыя забойствы ў Сеціфе былі хутчэй следствам трагічнай памылкі, чым вынікам спецыяльнай антыарабскай урадавай аперацыі — так можна падумаць, пабачыўшы карціну.

Таму, здаецца, больш цікавыя падзеі адбываліся звонку кінатэатра. Тут каля 1500 чалавек пратэставалі супраць дэманстрацыі карціны. Акцыю арганізавалі партыі UMP, Нацыянальны фронт, Нацыянальны саюз ветэранаў і аб'яднанні г. зв. Pieds Noirs — французскія рэпатрыянты з Алжыру. Маніфестацыя мела вялікі рэзананс, хаця б таму, што галісты і нацыяналісты сталі на акцыі побач.

Скандал у любым выпадку паказаў неабходнасць далейшай палемікі. На днях усё той жа Ліанэль Лука паглядзеў нарэшце ненавісны яму фільм, каб пасля даць справе новы штуршок. На яго думку, стужка — спроба пераглядзець афіцыйную трактоўку другой сусветнай вайны. Па словах Лукі, аўтары карціны намагаюцца давесці, што фактычным днём перамогі для алжырцаў было не 8 мая 1945-га, а 5 ліпеня 1962 года (менавіта ў гэты дзень Алжыр стаў незалежнай дзяржавай). Тым самым фільм праводзіць, як лічыць дэпутат, паралель паміж нацысцкім і каланіяльным французскім рэжымамі.

МЕРКАВАННЕ

# АПОШНІ ЦВІК У ТРУНУ МАЛДАЎСКАГА КАМУНІЗМУ

**Малдова можа стаць першай краінай СНД, дзе забароняць камуністычныя сімвалы. 31 мая камісія па даследаванню «таталітарнага камуністычнага рэжыму» прадставіла справаздачу з адпаведнымі рэкамендацыямі. Пра рэакцыю малдаўскага грамадства на высновы камісіі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з малдаўскім палітолагам Наталляй Сіняевай.**



***— Як і калі была сфармавана камісія? Чаму ўзнікла неабходнасць у такім даследаванні?***

— 14 студзеня гэтага года ўказам Міхала Гімпу, які часова выконвае абавязкі прэзідэнта Малдовы, была створаная камісія, якая мусіла «вывучаць злачынствы таталітарнага савецкага рэжыму ў гады Савецкай улады». У камісію ўключылі 30 чалавек. Да 1 чэрвеня група спецыялістаў павінна была прадставіць вынікі сваёй працы. Гэтыя вынікі ў форме рэкамендацый пасля павінны былі накіраваць у адміністрацыю прэзідэнта, і яны мусілі стаць падмуркам спецыяльнага законапраекту. Законапраект планавалася вынесці на разгляд парламенту да канца вясенняй сесіі. Неабходнасць падобнай камісіі тлумачылі рэзалюцыяй Савета Еўропы, якая асудзіла сталінізм. Таксама спасылаліся на досвед Польшчы і Венгрыі, дзе ўжо дзейнічае спецыяльнае заканадаўства супраць публічнай дэманстрацыі і выкарыстання камуністычнай сімволікі. Нарэшце, перад камісіяй стаяла задача даць навуковую ацэнку мінулага.

***— Якія асноўныя высновы камісіі?***

— Камісія прызнала, што перыяд знаходжання Малдовы ў складзе Савецкага Саюза быў звязаны з вялікім навуковым і культурным прагрэсам. Аднак цана, якую грамадства заплаціла за гэты прагрэс, была занадта высокай. Па інфармацыі камісіі, больш за 300 тысяч грамадзян Малдовы былі дэпартаваныя, з іх прыкладна 230 тысяч чалавек у выніку памерлі або былі забітыя. Па падліках, рэпрэсіі прынеслі краю шкоду памерам у 28 мільярдаў долараў ЗША. Цікава, што нейкім чынам сябры камісіі палічылі, што за 55 тысяч малдаван, якія загінулі на франтах другой сусветнай вайны, СССР павінна кампенсаваць Кішынёву 5,9 мільярда долараў. Аднак ніякіх прэтэнзій да Расіі як краіны — нашчадка СССР у выніку выстаўлена не было. Галоўнае ў справаздачы камісіі — у рэкамендацыях. Рэкамендацыя нумар адзін: заканадаўча забараніць выкарыстанне паняцця «камунізм» і ўсіх яго вытворных, увесці забарону на выкарыстанне камуністычнай сімволікі ў назвах палітычных партый, прадпрыемстваў, устаноў, а таксама «на выкарыстанне камуністычнай і нацысцкай сімволікі ў палітычных мэтах».

***— Як малдаўскае грамадства рэагавала на факт стварэння камісіі, яе працу і вынікі?***

— Вельмі неадназначна. Прычым пратэставалі не толькі камуністы, аднак і прадстаўнікі дэмакратычнага лагера. У камісію з самага пачатку ўключылі спецыялістаў, якія вядомыя сваім падыходам да гэтай эпохі. Ніводны гісторык з альтэрнатыўнымі поглядамі ў склад камісіі не трапіў. Было відавочна, што ўладам патрэбны дакумент з высновамі, якія могуць стаць козырам у палітычнай барацьбе. На носе выбары ў парламент, і ліберальная партыя Гімпу хацела б аслабіць галоўных канкурэнтаў — камуністаў. Гэта ўстаноўка — правесці даследаванне ў кароткі тэрмін без шырокай дыскусіі — безумоўна паўплывала на ўзровень працы сяброў камісіі і стаўленне публікі да яе высноў. Таксама шмат каму не спадабаўся прынцып падбору сяброў камісіі. У камісію ўключылі людзей, якія ў часы СССР верай і праўдай служылі «таталітарнаму рэжыму». Так, старшыня камісіі ў свой час праслевіўся выступам на рэспубліканскім жалобным мітынгу з прычын смерці генсека Чарненкі. «Зноў нас спасцігла вялікае гора», — не хаваў ён тады эмоцый. Гэта яшчэ кветачкі. Адзін з сяброў камісіі ў часы саўдэпіі даносіў на сваіх калег па працы ў КДБ. Шэраг незалежных гісторыкаў і палітолагаў звярнуліся да Гімпу з просьбай уключыць іх у групу даследчыкаў. На што ў адміністрацыі прэзідэнта ім сказалі, што цягнік ўжо сышоў.

***— Чаму камуністы так істэрычна крытыкуюць высновы камісіі? Можна ж правесці рэбрэндынг і выступіць пад нейтральнейшай назвай? Тым больш, што групоўку Уладзіміра Вароніна цяжка лічыць партыяй паслядоўных марксістаў-ленінцаў.***

— Любы рэбрэндынг, ды яшчэ ва ўмовах фактычна стартаваўшай выбарчай кампаніі, — аўтаматычная падстава для расколу партыйнага маналіту. Відавочна, што ўнутраная апазіцыя Вароніну скарыстаецца дэбатамі наконт новай назвы для атакі на лідэраў. Аўтарытарны стыль Вароніна шмат каму, асабліва моладзі, не падабаецца. Па-другое, камуністычная рыторыка і сімволіка — здаецца, апошняе, што адрознівае камуністаў ад іншых партый. Па падліках спецыялістаў, змена назвы і сімволікі нанясе шкоду партыі ў выглядзе страты 20–30 працэнтаў выбаршчыкаў.

***— Ці дастаткова ў лібералаў Гімпу дэпутацкіх мандатаў, каб забараніць серп і молат?***

— Гімпу і яго партыя лібералаў — сябры Альянсу за еўрапейскую інтэграцыю. Хаця партыі альянсу разам маюць большасць у парламенце, лёс законапраекту вельмі спрэчны. У кааліцыю ўваходзіць таксама Дэмакратычная партыя, якая аб'ядноўвае былых камуністаў. 14 чэрвеня Дэмпартыя заявіла, што не будзе падтрымліваць закон пра забарону сімволікі. Дэмакраты прапануюць звярнуцца да дакладу і рэкамендацый камісіі пасля выбараў, калі «краіна атрымае трывалую і стабільную ўладу». Без мандатаў дэмакратаў законапраект не атрымае патрэбнай большасці.

***— Ці можна тэхнічна рэалізаваць закон аб забароне ўсяго, што звязана з камуністычнымі часамі?***

— Гэта самы слабы момант у праекце. Патрэбна будзе судзіць або штрафаваць ветэранаў, якія публічна носяць савецкія ардэны. Што рабіць з мемарыяламі савецкім салдатам, якія згінулі ў Малдове ў часы вайны? Паколькі ў справаздачы камісіі прысутнічаюць таксама рэкамендацыі забараніць усе паняцці і назвы вытворныя ад слова «камунізм», то трэба забараніць газету «Камсамольская праўда», у назве якой ёсць абрэвіятура ад слова «камуністычны»? Ці трэба таксама выразаць застаўкі з усіх фільмаў, выпушчаных на студыі «Масфільм», знакам якой з'яўляецца скульптура «Рабочы і калгасніца», якія трымаюць серп і молат? Адказу на гэта пытанне не ведае ніхто. У гэтым плане праца камісіі здаецца нейкім непрадуманым заказам, выкліканым рэфлексіяй на паўсядзённы палітычны працэс. Мне здаецца, што ідэя Гімпу хутчэй перашкодзіла малдаўскаму грамадству разабрацца са сваім мінулым.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ЯКАБ ЗУМА

Пакуль на стадыёнах краіны поўным ходам ідзе чэмпіянат свету па футболу, сам прэзідэнт ПАР і ягоная партыя Афрыканскі нацыянальны кангрэс (ANK) заўзята змагаюцца з прыбіральнямі. Непасрэдна полем бітвы стаў прыгарад Кейптауна, дзе дзесяткі гадоў не было каналізацыі. ANK увесь час абяцала нешта зрабіць, аднак дасюль рукі не дайшлі. Затое не спяць галоўныя палітычныя канкурэнты ANK з Дэмакратычнага альянсу. Хаця Дэмакратычны альянс традыцыйна абараняе інтарэсы белай камуны, ягонае кіраўніцтва хацела б атрымаць і галасы чарнаскурых выбаршчыкаў. Таму кіраўніцтва альянсу ўмяшалася ў праблему каналізацыі: працягнула сюды каналізацыйныя трубы і выдала кожнаму ўладальніку дома ўнітаз. Планавалася, што кабінкі пабудуюць самі гаспадары дамоў. Аднак 7 працэнтаў насельніцтва не знайшлі сродкаў нават на такую няхітрую канструкцыю. Тады Дэмакратычны альянс вырашыў дапамагчы бедным з будаўніцтвам кабінак. Гэта выклікала пратэст з боку лідэраў ANK, якія палічылі гэта праявай белага расізму. Моладзевая секцыя ANK правяла марш па кварталах, падчас якога знішчыла ўсе падараваныя Дэмакратычным альянсам прыбіральні. А кіраўніцтва ANK заклікала сяброў партыі выходзіць на вуліцы і на знак пратэсту супраць туалетнай правакацыі белых паліць аўтамабільныя шыны.

### ТОМАС БАРЭЙС



Дэпутат Бундэстага ФРГ даў зялёнае святло адміністратыўнай рэформе ФРГ, падтрымаўшы ініцыятыву эсдэкаў і Зялёных узбуйніць шэраг зямель. Сёння ў склад нямецкай федэрацыі ўваходзяць 16 зямель. На думку дэпутата, цалкам хапіла б і восем. «Нам трэба змяніць прынцып федэралізму», — рашуча кажа чыноўнік. Без рэформы, па яго словах, федэрацыі пагражае крызіс. Праўда, як рэалізаваць ідэю, пакуль не зразумела. У канстытуцыі няма ніводнага слова пра тое, што землі могуць ліквідавацца шляхам аб'яднання з суседнімі. Іншымі словамі, патрэбныя папраўкі ў асноўны закон. Акрамя таго, на месцах існуе моцная палітычная традыцыя. Шмат зямель доўгі час былі незалежнымі дзяржавамі, маюць сваю асобную палітычную культуру і, адпаведна, проста так не паступяцца аўтаноміяй. Хаця ёсць прыклады іншага кшталту. Так, у 1952 годзе ўдалося дабіцца аб'яднання Бадэна і Вюртэмбергу ў адну зямлю Бадэн-Вюртэмберг, якая, дарэчы, з'яўляецца адной з самых заможных у краіне.

### ПАВЕЛ АСТАХАЎ



Упаўнаважаны па правах дзяцей пры прэзідэнце Расейскай Федэрацыі выступіў з сенсацыйнай заявай. Калі яму верыць, у Дзяржаўнай думе існуе арганізаванае лобі педафілаў. Дэпутаты, якія ўваходзяць у гэтую групу, свядома блакіруюць прыняцце законаў, накіраваных на барацьбу з гэтым відам злачынства. Прычым у клана добрыя сувязі ва ўсім дзяржаўным апараце. У якасці прыкладу Астахаў прыводзіць нядаўні судовы працэс над педафілам, які 4 гады гвалціў сваю пляменніцу. У выніку суда ён атрымаў 6 гадоў умоўна. У той жа час закон кажа: сексуальныя адносіны з непаўнагадовымі караюцца турэмным тэрмінам 8–15 год. Праўда, той прысуд ужо адменены, а справа пайшла на новы разгляд. Цікава, што віцэ-спікер Думы Любоў Слiска пацвердзіла словы Астахава пра наяўнасць у парламенце арганізаваных лабісцкіх структур педафілаў. Хаця імёны дэпутатаў, якія супрацьстаяць барацьбе з вычварэнцамі, яна называць чамусьці адмовілася.

ВЫСТАВА

# ВАЙНА: ПОГЛЯД СВЕДАК І НАШЧАДКАЎ

Аляксей ХАДЫКА

**Днямі па беларускім тэлебачанні дэманстравалася перадача пра творчасць Андрэя Кудзіненкі, у прыватнасці фільм «Акупацыя. Містэрыі». Гутарка вялася пра тое, што вайна ставіць людзей у розныя складаныя сітуацыі, прымушаючы індывідуальна ўспрымаць паняцці «вораг», «здрада», «перамога». У кожнага свая вайна, яе досвед індывідуальны. На фоне пастаўленых на катурны пампезных святкаванняў, да якіх краіну прывучылі апошнімі гадамі ў прамежак часу паміж 9 мая і 3 ліпеня, шчырасць гутаркі на вечныя тэмы прыцягвала ўвагу.**



Менавіта такі гуманістычны і прыватны тон дачынення з гледачом вылучае выставу «65 год Вялікай Перамозе», якую прапануе наведаць з 6 мая па 12 ліпеня Нацыянальны мастацкі музей краіны. Супрацоўнікі аддзелаў сучаснага рускага і беларускага мастацтва экспанавалі на галерэі музея каля 100 твораў жывапісу, графікі і скульптуры са сваіх калекцый, што амаль пазбаўленыя няшчырасці афіцыёзнага «апладысментнага» стылю. Няма звыклых прапагандысцкіх вобразаў: лунання сцягоў, парадных маршаў, урачыстых сустрэч — ёсць штодзённае жыццё, яго пранізліва натуральны, як у люстэрку, адбітак, і ёсць высокі ўзровень мастацтва.

Экспазіцыю збіралі, абвясціўшы галоўнымі крытэрыямі якасць твораў і шчырасць выяўленага ў іх пачуцця — экстрэмальнай атмасферы вайны было цалкам дастаткова, каб справакаваць яго без штучных намаганняў. Галоўнае, што адчуць рэаліі эпохі дазваляюць творы, якія ўзніклі ў гады вайны і першыя паваенныя часы — палову экспазіцыі займае мастацтва 1940-х. Канон апявання батальнага подзвігу яшчэ не склаўся і канчаткова не «забранзавеў». А дух часу ажываў не абавязкова ў сюжэтных сцэнах, эмацыйна пульсуючы нават у нацюрмортах і краявідах. Калючы «Чартапалох» (1942) Васіля Якаўлева, дзе чырвоныя ніты дыванка, на якім стаіць ваза з раслінай, зяяюць, як кроплі крыві. Шэрая, халодная і непрытульная маскоўская «Зіма» (1944) Мікалая Крымава. І абсалютна зменены, мажорныя фарбавыя сімфоніі праз некалькі месяцаў — як прадчуванне хуткай перамогі — у краявідах Аляксандра Асмёркіна («Загорск. Троіца-Сергіеўская лаўра», 1944) і Фёдара Мадорава («Уладзімір. Раніца. Май 1945»).

Надзвычай цікавыя як мастацкай якасцю, так і сваёй фактурай, адлюстраваным прадметным светам у гэтай частцы — творы беларускага зместу. Нечаканая гуаш Міхася Філіповіча (1896–1948) «Кавалерыйская атака. Разгром немцаў пад Масквой», як цытата з рамантычных батальных сцэн XIX стагоддзя з удалымі паўстанцамі на конях — поўная лінейнай экспрэсіі і выразнасці колеру: талент Філіповіча выяўляецца і ў маленькім абразку. Надзвычай каштоўная дакументалістыка першых год вызваленага ад фашыстаў Мінска — блізкія кожнаму мінчуку вобразы плошчы Свабоды (Анатоль Какорын, «Мінск. Палонныя немцы», 1944) і цэнтральных праспектаў і вуліц у час адбудовы (графіка Ганны Самайлоўскіх, палатно трыццацігадовага Віталя Цвіркі). Не зусім звыклай для наведвальніка юбілейнай ваеннай выставы падаецца тэма звычайнага штодзённага жыцця ў глыбокім тыле, у эвакуацыі — выдатны каларыстычны абразок «Вуліца ў Тбілісі» (1942) Леаніда Туржанскага.

Асобна звернем увагу на выдатную мастацкую якасць значнай часткі экспанаваных твораў — трыпціх «Будаўнікі» (1947) Юрыя Піменава, «Бэз на вакне» знакамітага майстра нацюрмортаў Пятра Канчалоўскага, з беларускіх мастакоў — пранізлівая экспрэсіўная кампазіцыя «Макі» (1968) Мікалая Залознага. Апошняя ўключаецца ў наступную тэматычную групу — аповедаў паваеннага пакалення пра вайну, прадстаўленых работамі мастакоў, якія здолелі раскрыць тэму шляхам тонкага эмацыянальна-паэтычнага абагульнення. Такімі, як асветленая чырванню сонца на захадзе «Зямля» (1971) Віктара Грамыкі, пераведзены ў фармат карціны салдацкі фотаздымак «Вярнуліся» (1985) Мікалая Селяшчука альбо групавы сямейны партрэт «Светлая памяць» (1984) Леаніда Шчамялёва. Час мінае, даводзячы слушнасць уключэння лепшых карцін юбілейных выстаў да 30-ці і 40-годдзя Перамогі ў залаты фонд беларускага мастацтва.

Аўтары экспазіцыі вылучылі яшчэ адну тэматычную групу, уключыўшы ў яе працы беларускіх мастакоў, удзельнікаў вайны, — Барыса Аракчэева, Аляксандра Казлоўскага, Івана Дмухайлы, Паўла Масленікава. Іх творы не абавязкова звязаныя з ваенна-батальнай тэматыкай: даніна павагі пакаленню, якое засталося верным творчай прафесіі насуперак выпрабаванням часу. Побач з гэтай групай — некалькі ранніх узораў таго, як выкрышталізоўваўся абагульнены, а пазней кананічны, штампаваны вобраз перамогі ў вайне, названай Вялікай Айчыннай. Шматфігурныя, пафасныя кампазіцыі Яўгена Зайцава («Пахаванне героя», 1945) і Паўла Гаўрыленкі («Пераправа», 1945).

Разнастайнасць і рознааспектнасць бачання тэмы і погляд на з'яву праз прызму мастацкага дакумента — такое ўражанне пакідае выстава, цікавая тым, што дае магчымасць рабіць уласныя высновы. Не павучаючы, даючы аналізаваць, суперажываць і атрымліваць эстэтычную асалоду.

СПОВЕДЗЬ

# ЯК Я ЗНАЙШЛА САВАЮ МОВУ

Міхаліна ДЗЯТЛІК

**Зараз я вельмі ўдзячная той сітуацыі, што склалася напярэдадні майго паступлення ў першы клас. Тады ж гэта быў сапраўдны стрэс для маіх бацькоў.**

У школу, да якой я належала па месцы жыхарства, мяне адмовіліся прымаць з-за таго, што ў ёй і так было зашмат вучняў. У прэстыжнай школе з англійскім ухілам, куды пайшлі ўсе мае сяброўкі, на іспытах мне наўмысна заніжалі адзнакі. Знаёмыя казалі (бо ведалі на ўласным вопыце), што трэба даць хабар дырэктару. Не ведаю, ці то ў нас не было грошай, ці то не захацелі даць хабар, але пытанне школы так і заставалася нявырашаным. Тады тата ўзяў мяне за руку і павёў у беларускую нацыянальную гімназію за шэсць аўтобусных прыпынкаў ад дома. Іспыты на той час ужо скончыліся, але настаўніца, да якой мы зайшлі ў класу, згадзілася правесці са мной уступнае тэставанне.

Калі я выканала ўсе заданні і адказала на ўсе пытанні, бацькі пацікавіліся, колькі ім чакаць выніку, ці таксама месяц, як і астатнім прэтэндэнтам. На што настаўніца поўным захапленнем голасам адказала, што не трэба чакаць, што такую разумную дзяўчынку яна адразу забірае ў свой клас.

Навучанне на беларускай мове ішло натуральным чынам, і я неяк не адрознівала адну мову ад другой, нягледзячы на тое, што сям'я ў мяне цалкам рускамоўная. Я не памятаю, калі зразумела, што ў маёй краіне двухмоўе, але ў памяці заўжды стаіць адна карціна. Раніца. Бацька па слізкай сцяжынцы вядзе мяне да аўтобуснага прыпынку. Я, напэўна, навучаюся ўжо ў другім класе, бо хвалюся, што ведаю ўжо даволі шмат беларускіх слоў. Прашу тату, каб ён назваў мне слова на рускай мове, а я перакладу яго на беларускую. Тата загадвае слова «*зонт*». Падумаўшы з хвіліну, я ўпэўнена кажу, што так і будзе. А ў адказ чую, што «*зонт*» па-беларуску — гэта «парасон».

Мінаў год за годам. Я добра разумела беларускую мову і трошкі горш рускую. Усе тэрміны з прадмета рускай мовы кшталту «*подлежащее*», «*сказуемое*», «*имя прилагательное*» я не разумела, не магла запомніць беларускія адпаведнікі і ўвесь час блытала іх. Не разумею я іх і зараз. Часам, гаворачы яшчэ па-руску, здаралася такое, што я казала якое-небудзь адно беларускае слова, а потым з засмучанай усмешкай паўтарала яго яшчэ некалькі




разоў, але не магла ўспомніць перакладу на рускую мову, і даводзілася тлумачыць яго сэнс для суразмоўцы сваімі словамі.

Напрыканцы дзевятага года навучання лёс склаўся так, што далей вучыцца ў гімназіі было папросту немагчыма, і таму я вымушана была шукаць іншую школу. І не цяжка здагадацца, што новая школа была рускамоўнай, як і сотні іншых школ у нашай краіне. І, верагодна б, на гэтым маленечкім вітку далёка не сусветнай і нават не нацыянальнай гісторыі знік бы ў нябыт яшчэ адзін беларус. Але, як пакажа гісторыя далей, той беларус тады яшчэ не нарадзіўся.

А нараджэнне гэта адбылося, калі я паступіла ва універсітэт. Аднойчы, недзе на другім месяцы навучання, вяртаючыся дадому разам з хлопцамі з майго курса, якія таксама ездзяць на метро, я пачула, як адзін з іх спрабуе размаўляць па-беларуску. Спрабуе няўпэўнена, і, відаць, хутчэй за ўсё, жартуе... але калі ў другі раз выпала вяртацца дадому разам, я зноў пачула беларускую гаворку. А на чацвёрты ці пяты раз я пацікавілася ў таго хлопца, ці даўно ён размаўляе на беларускай мове.

— Не, я толькі вучуся, — пачула ў адказ.

Я тады запэўніла яго, што ў яго вельмі добра атрымліваецца, і, каб падтрымаць, стала таксама адказваць па-беларуску.

А тым часам недзе глыбока ў маёй душы прачнулася ці то рэўнасць, ці то зайздрасць і нейкі спаборніцкі інстынкт. Усё разам гэта ператварылася ў ціхае і добрае абурэнне тым, што вось нейкі хлопец вучыцца размаўляць на беларускай мове, а я, праседзеўшы дзевяць год у беларускай нацыянальнай гімназіі, чамусьці размаўляю па-руску. І тады я перайшла да беларускай мовы ў гутарках з бабуляй і дзядулем, з самымі блізкімі сябрамі. Напачатку часта забывалася, саскоквала на рускую, а сама беларуская гаворка, што ішла з маіх вуснаў, была запаволенай, бо ўсё ж за два гады рускамоўнай школы родныя словы трохі пазабываліся. Але неўзабаве забытае ўспомнілася, я пачала развіваць сваю мову, шукаючы новыя і цікавячыся незнаёмымі словамі... І нарадзіўся яшчэ адзін беларус.

І як з Новага года людзі пачынаюць новае жыццё, так і я за 2009 год значна пашырыла кола тых маіх знаёмых, з кім размаўляла па-беларуску, а ад самага пачатку 2010 года я цяпер размаўляю на роднай мове з усімі, з кім увогуле даводзіцца размаўляць. І нічога, што ўсе вакол размаўляюць са мной па-руску і толькі два чалавекі неяк спрабуюць таксама адказваць мне на беларускай мове. І нічога, што той хлопец, які несвядома падштурхнуў мяне да роднай мовы, цяпер чамусьці сам карыстаецца рускай. Але я цяпер ужо не кіну беларускай мовы і не вярнуся да рускай.

ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫІ

# СВЯТАЯ ЕФРАСІННЯ І ЯЕ СКАРБЫ

Аляксей ХАДЫКА

**5 чэрвеня споўнілася 100 гадоў з дня, калі праз некалькі стагоддзяў з Кіева-Пячорскага манастыра на радзіму ў Полацк з вялікімі ўрачыстасцямі вярнуліся мошчы самай слаўнай беларускай святой Ефрасінні Полацкай. Як тады, тысячы вернікаў узялі ўдзел у Полацку ва ўрачыстых набажэнствах у Крыжаўзвіжанскім саборы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Фотавыстава «Незабыўныя дні» ў мастацкай галерэі вярнула палачан у 1910 год. Прайшлі прысвечаныя Ефрасінні навуковыя чытанні і кінафестываль духоўных фільмаў.**







Як вяртанне мошчаў святой на радзіму, так і іншыя абставіны яе жыцця, поўныя ўзнёслага сэнсу. Яе «Жыціе», напісанае напрыканцы XII стагоддзя невядомым манахам, выдатнейшы помнік старабеларускай літаратуры, дайшло да нашчадкаў у сотні спісаў шасці розных рэдакцый. Храм св. Спаса быў узведзены, як апавядае «Жыціе», за 30 тыдняў дойлідам Іаанам з Боскаю дапамогаю — цагляныя пліты, якіх неставала ў апошні момант, каб скончыць будоўлю, голас з неба падказаў адшукаць забытымі ў печы. Вандруе па Расіі абраз «Божай Маці Адзігітрыі-Пуцевадзіцельніцы», полацкі спіс візантыйскага абраза, атрыманага Ефрасінняй з Канстанцінопаля. Крыж св. Ефрасінні, шэдэўр злотніка Лазара Богшы, знак-абярэг Беларусі, што таямніча знік у ліпені 1941 года з Магілёўскага музея, чакае свайго вяртання на радзіму.

## Вяртанне святой

Сама Ефрасіння вярталася ў Полацк доўга. Дачка полацкага князя Святаслава-Георгія (сына Усяслава Чарадзея) і Сафіі, народжанай кіеўскім князем Уладзімірам Манамахам, яна прыйшла ў свет са славянскім імем Прадслава. Каб па дасягненні 12 гадоў расчараваць бацькоў, адмовіўшыся прымаць звычайны лёс князёўны ў выглядзе роўнай па пасагу шлюбнай партыі. «Што ж паспелі роды нашыя, якія былі да нас? Жаніліся і выходзілі замуж, і княжылі, але не вечна жылі… слава іхняя, быццам прах, горай за павуцінне…», — мовіла Прадслава, абіраючы манаскі шлях.

Пострыг яе адбыўся таемна ад бацькоў у дзень св. Ефрасінні Александрыйскай, паводле меркавання даследчыка Аляксея Мельнікава — 25 верасня 1116 года. І пачаўся шлях духоўны, за які «памятаюць на зямлі», — перапісванне кніг, заснаванне манастыроў і храмаў, аздабленне іх творамі высокага духоўнага мастацтва. Служба Полацку і яго люду. Калі св. Ефрасіння, ужо ігумення Спаскага манастыра, пакідала Полацк у 1167 годзе, каб памаліцца пры Труне Гасподняй у Іерусаліме, палачане праводзілі яе з плачам: «Куды заходзіш, святло вачэй нашых?» Як бы прадчуваючы доўгае расстанне. Паспеўшы ўбачыць Святую Зямлю і памаліцца, Ефрасіння спачыла ў Іерусаліме і з пашанай была пахавана там у Феадосіевым манастыры.

Шлях дамоў пачаўся ў 1187 годзе. З Іерусаліма, абложанага султанам Саладзінам, за выкуп манахі з Русі здолелі вывезці нятленна захаваныя мошчы святой. Паданне сцвярджае, што кіраваліся яны ў Полацк, але з-за адвечнага суперніцтва Полацка з Кіевам данеслі скарб толькі да апошняга. Дзе ў Пячорскім манастыры ў падземным храме Звеставання Багародзіцы ў срэбнай труне з адкінутым для назірання і пакланення вечкам св. Ефрасіння затрымалася больш чым на сем стагоддзяў.

На радзіму святая, шанаваная і праваслаўнымі, і грэка-каталікамі, і каталікамі, вярнулася пасля настойлівых просьбаў вернікаў ужо ў царскія часы. Магчыма, менавіта павага да яе не толькі сярод праваслаўных спыняла цароў, пачынаючы ад Аляксандра II, даць дазвол беларусам на атрыманне святыні. Наважыўся толькі Мікалай II. У 1910 годзе Полацк перажыў сапраўднае свята.

## Таямніца крыжа

Але з Ефрасінняй звязаныя іншыя сімвалы хрысціянства ў Беларусі. Перш за ўсё — Крыж Лазара Богшы. Шасціканцовы крыж-каўчэг з кіпарыса, абкладзены 21 залатой пласцінай з каштоўнымі камянямі, з нізкай перлаў па краі, 20 эмалямі з выявамі святых і пяццю гнёздамі для мошчаў — святых Стэфана, Дзмітрыя, Панцеляймона, кавалачка святога крыжа з крывёй Хрыста і каменьчыкам ад труны Багародзіцы… Выявы на эмалях — Хрыста, Багародзіцы, Іаана Прадцечы, айцоў царквы, евангелістаў, архангелаў і апекуноў бацькоў і самой Ефрасінні — свсв. Сафіі, Георгія, Ефрасінні Александрыйскай.

Выключнай якасці ювелірны шэдэўр, які мог паспрачацца з лепшымі творамі ювеліраў Царграда, быў закліканы асцерагаць Спаскі манастыр і горад. Пра гэта казаў надпіс, выбіты на пласцінках: «У лета 6669 (1161) кладзе Ефрасіння святы крыж у сваім манастыры, у царкве святога Спаса… І хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, не аддаюць…» І далей — праклён пад страхам страшнай кары парушальнікам, а таксама імя майстра, які выканаў працу, — Лазар Богша.

Загавор дзейнічаў не заўсёды: ужо ў канцы XII стагоддзя яго вывезлі смаленскія князі, а са Смаленску ў 1514 годзе ў Маскву яго забраў Васіль III. Як ні дзіва, спалохаўшыся праклёну, крыж вярнуў у Полацк Іван Жахлівы… Пра нешчаслівы лёс святыні ў XX стагоддзі многа пісалі. Перажыўшы шмат якія ліхалецці, святыня была канфіскавана бальшавікамі ў 1921 годзе. У 1928-м, дзякуючы тагачаснаму дырэктару Беларускага дзяржаўнага музея і былому прэм'еру Беларускай Народнай Рэспублікі Вацлаву Ластоўскаму, з полацкага фінаддзела яна трапіла ў Мінск, каб праз год быць вывезенай у Магілёўскі музей.

Магілёў меўся стаць сталіцай БССР, і разам з установамі туды перамяшчаліся многія каштоўнасці. Крыж захоўваўся ў адмысловым пакоі-сейфе дарэвалюцыйнага зямельнага банка, на той час абкама і гаркама партыі, за браніраванымі дзвярыма. І загадкава знік напачатку вайны, як растаў у паветры, разам з іншымі выдатнымі музейнымі экспанатамі, такімі, як залатыя упрыгожанні з раскопак Пампей.

Паваенная савецкая версія знікнення — нямецкі след — выглядала не надта пераканаўчай, улічваючы, што немцы трапілі ў Магілёў толькі напрыканцы ліпеня 1941 года. Як і пошукі ў амерыканскіх калекцыях Морганаў і Ракфелераў, куды беларускіх даследчыкаў накіроўвалі эксперты піцерскага Эрмітажа. Затое публікацыі пра пошукі крыжа 1990-х гадоў далі спадзяванні на тое, што ён знойдзецца ў Маскве.

Адгукнуўся Пётр Паддубскі, кіроўца, які 13 ліпеня 1941 года на грузавой машыне вывозіў з магілёўскага музея ў Маскву запакаваныя каштоўнасці, перададзеныя затым ва Упраўленне Чырвонай Арміі на Ленінскіх гарах. І чуў пры пагрузцы сказаныя кімсьці словы: "Які прыгожы крыж!" А разам з Паддубскім у машыне ехаў сам першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка. Між тым, гісторык Віталь Скалабан у 2003 годзе ў Нацыянальным архіве РБ знайшоў «Сценаграму пасяджэння бюро ЦК КП(б) Беларусі ад 26.08.1943 года». І ў ёй — словы таго ж Панамарэнкі пра твор Богшы, з якіх вынікае, што крыж нікуды не знік.

Зрэшты, крыж зарэгістраваны як прадмет пошуку і ў Інтэрполе, і застаецца спадзявацца, што ён вернецца ў Полацк — каштоўнасці такой якасці не губляюцца бясследна.

## Разам з абразом

Гісторыя іконы Полацкай Адзігітрыі не менш складаная. «Жыціе св. Ефрасінні» апавядае пра тое, як ігумення заснавала ў Полацку мужчынскі манастыр з храмам Багародзіцы, які яна пастанавіла аздобіць храмавым Багародзічным абразом з самога Царграда. Адпраўлены ў Канстанцінопаль «з дарамі каштоўнымі» да сваяка Ефрасінні імператара Мануіла і патрыярха Лукі полацкі пасол выканаў сваю місію паспяхова. Хаця і атрымаў для Полацка не Эфесскую, а Іерусалімскую Адзігітрыю-пуцевадзіцельніцу, і, безумоўна, не пратограф быццам пэндзля евангеліста Лукі (г. зн. старажытны абраз), а спіс. Дзеля гэтага патрыярх з епіскапамі блаславілі новы абраз у св. Сафіі ў Царградзе.

Аднак Полацкая Адзігітрыя, якая ў 1930 годзе трапіла ў Рускі музей у Піцеры праз Тарапец у Цвярской вобласці, датуецца навукоўцамі пачаткам XIV стагоддзя. Значыць, захавалася выкананая ўжо ў Полацку копія візантыйскага арыгіналу? Так ці інакш, папулярная версія пра перанясенне абраза з Полацка ў Тарапец у 1239 годзе, калі там адбываўся шлюб Аляксандра Неўскага з полацкай князёўнай Параскевай з Рагвалодавічаў, наўрад ці даставерная.

Уладзімір Арлоў у сваёй кнізе пра св. Ефрасінню звяртае ўвагу на верш асветніка і паэта Сямёна Полацкага «*Априль 27. Взенто образ насвентшэй Богородзицы з Полоцка до Москвы*», дзе вядзецца пра прынесены ёй «*От Цари града або из Иефесе» абраз Багародзіцы*. Які зараз, як піша паэт, з Полацка вывезены і трэба яго ў горад вярнуць, паколькі ён «*Полотски граду бе утвержение, // Столп, стена, помочь ы огражение*».

Калі справа ідзе пра Полацкую-Тарапецкую Адзігітрыю, першыя гістарычныя звесткі пра знаходжанне якой у Тарапцы і датуюцца XVII стагоддзем, то шмат што ў вандроўках абраза становіцца зразумелым. І павышаецца верагоднасць перамалявання абраза менавіта полацкімі майстрамі ў пачатку XIV стагоддзя, калі візантыйскі арыгінал, верагодна, быў страчаны або папсаваны.

Яшчэ загадка: абраз з Рускага музея двухбаковы, але выява св. Мікалая на адваротным баку амаль страчана. І, на жаль, чакаць вяртання яго ў Полацк не даводзіцца, не толькі таму, што передача якіх там ні было вывезеных з Беларусі ў Расію мастацкіх твораў амаль не адбываецца нават у дакладна дакументаваных выпадках.

Музеі Расіі зараз адчуваюць ціск прэтэнзій з іншага боку. 24 лістапада патрыярх маскоўскі Кірыл звярнуўся да міністра культуры РФ Аляксандра Аўдзеева з просьбай перадаць Тарапецкую Божую Маці… у храм элітнага катэджнага пасёлка Істрынскага раёна Маскоўскай вобласці «Княжае возера»! І ўжо на наступны дзень дырэктар дэпартамента культурнай спадчыны і выяўленчага мастацтва Мінкульта РФ Рамазан Калоеў распарадзіўся: выдаць!

Адным словам, насуперак пратэстам супрацоўнікаў і рэстаўратараў, дырэктар музея Уладзімір Гусеў не стрымаў націску, і 3 снежня 2009 года абраз ужо быў у новазбудаваным храме Аляксандра Неўскага. Чаму? Папросту будаўнік пасёлка, дзе катэдж каштуе ад 820 тысяч да 6 мільёнаў, — праваслаўны бізнесовец, гаспадар фонду «Іванава справа» Сяргей Шмакаў. І ён жа — апякун Багародзіцкага сабора ў Тарапцы, дзе калісьці знаходзілася Адзігітрыя, унёсак якога дапамог перакрыць дах і купалы.

Але галоўнае — не гэта, а унікальны для РПЦ прыход, які складаецца скрозь з мільянераў. Невыпадкова, праз два дні пасля прыбыцця абраза Полацкай-Тарапецкай у «Княжае Возера» царкву асвяціў сам патрыярх Кірыл.

***

Між тым, вяртанне мошчаў св. Ефрасінні ў 1910 годзе ў Спасаўскі храм было таксама не канчатковым. У гады бальшавіцкага панавання рака-захавальніца святой была ўскрытая бязбожнікамі дзеля экспертызы, адпраўлена на атэістычную выставу ў Маскву, потым у Віцебск. І толькі пры немцах, у часы акупацыі, вярнулася на сваё пачэснае месца. Будзем спадзявацца, што калі-небудзь св. Ефрасіння дачакаецца вяртання ў свой горад святога Крыжа. А магчыма, адведае радзіму і Полацкая Адзігітрыя.

▸ АГЛЯД

# АД НАЦЫЯНАЛЬНАГА ДА СУСВЕТНАГА

Аляксей ХАДЫКА

**У залах Нацыянальнага мастацкага музея разгарнуліся экспазіцыі двух беларускіх і адной ізраільскай мастачкі, адметныя яскравай своеасаблівасцю стылю кожнага з аўтараў.**

Пах фарбаў на выставе «Жывапіс разнастайнасці» Мацвея Басава — сведчанне актыўнай творчай практыкі гэтага мінскага мастака, які днямі адсвяткаваў 60-годдзе, а ў экспазіцыі прадставіў плён працы апошніх 15 гадоў. А таксама вынік своеасаблівай тэхнікі, якая прадугледжвае нанясенне на паверхню карціны тоўстага, пастознага слою фарбы, што стварае незвычайную рэльефную фактуру, зрокава падобную да паверхні грубай гліны або пяску. З гэтых пяскоў, якія цягне назваць пяскамі часу (бо тэмы Басава — то біблейскія, то адвечна паэтычныя вобразы жыцця і кахання), выступаюць твары, фігуры, постаці, высветленыя вібруючымі плямамі колеру на тэракотавым, шэрым, зялёным фоне.

Асацыятыўныя матывы, выкліканыя карцінамі, — старажытная кераміка, жывапіс катакомбных храмаў альбо першабытных пячор. Вобразы манументальныя, переведзеныя ў прастору вечнасці, але адначасова лірычныя, паколькі побач са старазапаветным «Майсеем» на палотнах — «Веснавы гай», квітнеючае «Дрэва жыцця» і поўныя пачуцця маладыя ў «Закаханасці». Індывідуальнасць высокага паэтычнага стылю Мацвея Басава непарыўна звязана і з падспудным адчуваннем нацыянальнай своеасаблівасці габрэйскай мастацкай традыцыі.

Апошняя выступае сапраўднай дамінантай, камертонам у другой экспазіцыі — «Веснавая мелодыя». Яна прадстаўлена Малкай Цэнцыпер з Ізраіля, матэматыкам, музыказнаўцай, а з сярэдзіны 1990-х — мастачкай. Ураджэнка паваеннай Вільні (1947), Малка перанесла на палотны, у якіх ажывае каларыстыка і стыль Шагала, пярэсты, тэатральны, шумны свет габрэйскага мястэчка. Адкрытыя, жывыя, характарныя да карыкатурнасці, яе героі кахаюць, сумуюць, весяляцца, спяваюць — праносячыся перад гледачом у няспынным руху, выклікаючы светлы эмацыйны водгук. Прадстаўленая пасольствам Ізраіля выстава паказвае іншую культуру гэтай дзяржавы, па-за пастаянным канфліктам з суседнімі краінамі, мірную і поўную аптымізму.





Што тычыцца «Прастакутнікаў Несцерава, альбо Экалогіі душы», выставы Рыгора Несцерава, то гэта — своеасаблівая арт-дэкларацыя неапуанцілізму, светлапісу, у якім вобразы на мяжы жывапісу і кампутарнай графікі ўзнікаюць з яркіх колеравых і светлавых плям. Жывёлы і людзі паўстаюць у вібруючай атмасферы мроі, сну, фантазіі. У прэамбуле да выставы мастак дэкларуе: «Чорны квадрат» Малевіча — квадрат адмаўлення візуальна бачнага свету, яго прыгажосці і разнастайнасці, і прапануе сваё разуменне гарманічнага быцця чалавека і навакольнага асяроддзя. Але і ў канструкцыі Несцерава дамінуе мастацкі прыём і форма: святло, промні, ззянне як метафарычны вобраз чысціні і еднасці свету. А выстава глядзіцца як адзіная інсталяцыя мастака-пантэіста, алтар жывым на зямлі — птушкам, жывёлам, чалавеку.

Выставы працуюць да 8 ліпеня, 28 чэрвеня і 5 ліпеня адпаведна.

▸ АНОНС

# АДНОЙЧЫ НОЧЧУ

Віталь СУПРАНОВІЧ

**Аднойчы ноччу на лепшай канцэртнай пляцоўцы сталіцы — у Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі — у адзінай часавай прасторы і тэрыторыі размесціцца трыо-фэст сучаснага мастацтва «Ноч музыкі». Новы праект Ларысы Сімаковіч стартуе 23 чэрвеня**



Гэта летняя ноч, як неспадзяваная высокая госця, тонкім штрыхом прапіша графіку музыкі Джона Кейджа, Арво Пярта, Піліпа Гласа, Алана Хаванэса ў выкананні амерыканскіх салістаў Крысціны Фонг (скрыпка, віяланчэль) і Міхаэля Карнацкі (кларнет).

Ноч, напоўненая мазуркамі Шапэна, абэрэкамі, куявякамі і полькамі мазавецкіх нізінаў, завершыцца «Калыханкай да Шапэна» — сумесным імправізаваным творам-прэм'ерай беларускіх кампазітараў, пакіне пачуццё здзіўлення, характа, таемнай прывабнасці і высокага, незямнога кахання.

## Танцоўшчык і яго акварэлі

«Ноч музыкі» змяшчае яркі мастацкі акцэнт. Фае Белдзяржфілармоніі пераўтворыцца ў экспазіцыю сучаснага жывапісу і графікі Беларусі, а таксама выставай акварэльных работ знакамітага танцоўшчыка сучаснасці, народнага артыста Расіі Уладзіміра Васільева.

Гэтай жа ноччу на вялікай сцэне Белдзяржфілармоніі ён пакажа сваю новую харэаграфічную работу памяці Кацярыны Максімавай на музыку Ф. Шапэна. Майстар будзе на сцэне разам з салісткай Вялікага тэатра оперы і балета Расіі Дар'яй Хахловай. За раялем — беларуская піяністка, лаўрэат міжнароднага конкурсу імя Ф. Шапэна — Кацярына Матох. Пад промнямі тэатральнага святла — дзве постаці танцоўшчыкаў, крэсла і раяль.

## Гучанне «Ночы музыкі»

Гэтай ноччу вы будзеце здзіўлены гучаннем шапэнаўскіх мазурак не толькі ў класічным выкананні, але і ў выкананні народных аўтэнтычных інструментаў — так, як некалі чуў іх сам Шапэн.

Вы не зможаце заснуць, бо будзеце зачаравана слухаць сумесны імправізаваны твор-прэм'еру беларускіх кампазітараў Сяргея Картэса, Віктара Капыцько, Вячаслава Кузняцова, Аляксандра Літвіноўскага, Ларысы Сімаковіч, Дзмітрыя Лыбіна і Кастуся Яськова «Калыханка да Шапэна». Выконваць гэту калыханку будзе Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора аркестра, заслужанага артыста Расіі Яўгена Бушкова.

«Агучваць» салаўіную «ноч» рыхтуюцца не толькі птушкі. На «Ноч Музыкі» запрошаны гурт з Варшавы «ZESPOL POLSKI», Крысціна Фонг (скрыпка, віяланчэль) і Міхаэль Карнацкі (кларнет) са Злучаных Штатаў Амерыкі, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Сяргей Мікулік, Юрый Бліноў, Кацярына Матох, Юлія Архангельская, Аляксандр Палякоў, Дзмітрый Уласюк.

Святлану Зелянкоўскую мы ўбачым у ролі Кансуэлы ў музычным спектаклі «Жорж Санд, мазурка і Шапэн», а таксама ў якасці чароўнай вядучай незвычайнай «Ночы Музыкі» разам з містэрам Х.

Да таго ж вас чакае пачастункавая філіжанка кавы і прысмакі для падзякі...

Сустрэнемся!.. Кожная ноч пачынаецца з вечара... але не кожная з музыкі!..

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 563

Падпісана да друку 18.06.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.